незалежная газета

№ 12 (610) 25 сакавіка 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## У НУМАРЫ

**Даляр уніз, еўра ўверх**

Прадказаная Пятром Пракаповічам нестабільнасць на сусветных фінансавых рынках пачалася. **Старонка 4.**

**Расія многа хоча ўзамен за новыя крэдыты**

Вынікі закрытых перамоваў Лукашэнкі і Мядзведзева ў Завідаве і Сочы. **Старонка 5.**

**Монстр на Старажоўскай**

Фірма «Трайпл» мае збудаваць у цэнтры Мінску гіганцкі даходны дом, які разбурыць мінскі краявід. **Старонка 9.**

**Край за небакраем, або Беларуская Прусія**

Дзе яшчэ ў Беларусі ёсць такія горы? Дзе яшчэ так чуваць подых Балтыкі? **Старонка 12.**

**Белтэст «Белсату»**

«Нарэшце!» Гэты быў ці не першы водгук, які давялося прачытаць у Інтэрнэце пасля таго, як з пасады дырэктаркі тэлеканалу была звольненая Агнешка Рамашэўская. Піша Віталь Тарас. **Старонка 6.**

**Бяжы, Інтэрнэшнл, бяжы**

Том Тыквер, аўтар мастацкай даганялкі «Бяжы, Лола, бяжы», зняў фільм, які паўгоду таму ніхто б глядзець не стаў. Піша Павал Касцюкевіч. **Старонка 11.**

# Дзень Волі



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Ці скароцяць заробак бюджэтнікам?

Такія чуткі ўпарта ходзяць.

У цяперашні час Мінфін Беларусі рыхтуе ўдакладнены варыянт бюджэту на 2009 год. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад ураду дасягнуць бездэфіцытнага бюджэту, і ўрад вымушаны быў прапанаваць скарачэнне заробкаў працаўнікоў бюджэтных арганізацый. Бездэфіцытны бюджэт, у сваю чаргу, быў умовай міжнародных крэдытораў для выдачы мільярдных крэдытаў Беларусі.

Далейшае абразанне заробкаў будзе мець прыхаваную форму.

Канкрэтныя прапановы, якія падрыхтаваў Мінфін, карэктуючы бюджэт, апублікаваныя пакуль не былі. Ніякай інфармацыі незалежным СМІ здабыць таксама пакуль не ўдалося.

У сувязі з дэвальвацыяй рубля рэальныя прыбыткі працаўнікоў дзяржсектару ўжо скараціліся на траціну ў даляравым выражэнні.

Калі далейшае абразанне заробкаў адбудзецца, яно, найхутчэй, будзе мець прыхаваную, расцягнутую, а не разавую форму.

Гэтак, у лютым сярэдні заробак бруднымі склаў 906 тыс. рублёў, паводле падліку дзяржаўнага Белстату. Гэты ж паказчык у студзені складаў 920 тыс., а яшчэ ў снежні сярэдні заробак перавышаў мільён рублёў.

**Мікола Бугай**




## Доўгія ўгаворы

Аляксандр Лукашэнка цягам мінулага тыдня двойчы ездзіў у Расію для сустрэч з Дзмітрыем Мядзведзевым. Інфармацыя з абодвух спатканняў прыходзіла мінімальная. Толькі з расійскіх СМІ можна было даведацца, пра што ж вялася гаворка за зачыненымі дзвярыма ў Завідаве і Краснай Паляне.

Нават тыя паведамленні пра перамовы 19 сакавіка, што прасочваліся ў расійскія інфармацыйныя агенцтвы, не ўтрымлівалі нейкай канкрэтыкі. Паводле афіцыйных звестак, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні беларуска-расійскага інтэграцыйнага ўзаемадачынення.

Як перадае Першы расійскі канал, сярод галоўных пытанняў сустрэчы было супрацоўніцтва ў вайскова-тэхнічнай і энергетычнай сферах, а «асаблівая ўвага была нададзеная крэдытна-фінансаваму ўзаемадзеянню». Ці не чарговы крэдыт прасіў Лукашэнка ў Завідаве?

**Працяг на старонцы 3.**

# Крызіс вяртае беларусаў дахаты

**Палякі з літоўцамі вымушана едуць з заробкаў дамоў. Праз гэта шмат хто з нашых суайчыннікаў губляе працу ў Літве і Польшчы.**

Сяргей працаваў у Варшаве ў вялікай будаўнічай кампаніі. Яшчэ нядаўна ён планаваў перабрацца стуль у Партугалію. Цяпер жа з Партугаліі пачалі вяртацца польскія будаўнікі, і яму трэба думаць, як утрымацца ў Варшаве. На асноўнай працы ён зарабляў каля тысячы еўра, акрамя гэтага, падпрацоўваў рамонтамі. Эканамічны крызіс падкарэктаваў ягоны бюджэт: заробак перастаў расці, яго пачалі выдаваць у злотых. «Добра, што хоць не зніжаецца», — сумна ўсміхаецца Сяргей. На «халтуру» давялося забыць — ашчаджаючы грошы, учорашнія кліенты рамантуюць кватэры ўласнымі сіламі.

Міколу, дальнабойшчыку з Гудагаю, не пашчасціла. Ён працаваў у невялічкай літоўскай кампаніі, уласнік якой меў шэсць «фураў». Цяпер аўтаперавозкі сталі нявыгаднымі для такіх маленькіх фірмаў, літовец прадаў пяць з шасці аўто, пазвальняў супрацоўнікаў, у тым ліку і беларуса. Такіх гісторый на Астравеччыне, адкуль шмат хто едзе шукаць лепшага заробку ў Літву, сёння можна пачуць безліч.

Зазналі праблемы і беларускія студэнты, якія мерыліся застацца на працу за мяжой. Аляксандр вучыцца ў Варшаўскім універсітэце. Застацца ў Польшчы на працу цяпер нерэальна, кажа Аляксандр. Калі, канечне, не лічыць працай раздачу рэкламы ў метро, бо на такі заробак пражыць праблематычна.

У будаўніка Сяргея варыянт вяртання на радзіму выклікае разгубленасць, бо акурат малыя заробкі ды ніякая дысцыпліна на айчынных будоўлях і падштурхнула яго з'ехаць. У Расію таксама не хоча, памятаючы свой колішні няўдалы досвед працы ў Падмаскоўі. Праца за мяжой, хай сабе і не самая лёгкая, давала, акрамя заробкаў, маральнае задавальненне. Вярнуцца да свайго пасля якасна іншых умоваў многім нялёгка.

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Пераход на летні час

29 сакавіка (нядзеля) Беларусь пераходзіць на летні час. А другой гадзіне ночы стрэлкі гадзіннікаў трэба будзе перавесці на адну гадзіну ўперад. Не спазняйцеся!

### Урад прапануе павялічыць тэрміны вяртання крэдытаў

Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ера Беларусі Віктар Бура на пасяджэнні прэзідыуму Саўміну. Так урад спадзяецца ўтрымаць аб'ёмы будаўніцтва.

**СМ, МБ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Выкладчыкі Беларускага Ліцэю запрашаюць

Бясплатныя курсы беларускай мовы, культуры, гісторыі з настаўнікамі Беларускага Ліцэю — сябрамі Таварыства беларускай мовы. Для вучняў 7—9 (9') класаў. Арганізацыйны збор **15 красавіка** 2009 г. а **18.00** на сядзібе ТБМ (**вул.Румянцава, 13, ст.метро «Плошча Перамогі»**).

## Пояс багацця вакол Мінску

Апублікаваны «Рэйтынг гарадоў Беларусі 2008: умовы развіцця чалавечага капіталу», зроблены польскім эканамістам М.Дуткоўскім і дацэнтам БДУ М.Залескім. Вынікі здзіўляюць: з першай дзесяткі сем пазіцый займаюць блізкія да Мінску гарады.

ТОП-10 выглядае так: 1. Заслаўе; 2. Мінск; 3. Фаніпаль; 4. Смалявічы; 5. Лагойск; 6. Дзяржынск; 7. Брэст; 8. Гродна; 9. Жодзіна; 10. Стоўбцы.

Чаму Міншчына наперадзе? Тут найбольшыя заробкі. Да таго ж, у малых гарадах лепшая экалогія.

**Ягор Марціновіч**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Цана «НН» зніжаецца да 1500 рублёў

Дзякуючы росту тыражу «Нашай Нівы» знізіўся сабекошт газеты. Таму ад красавіка газета будзе прадавацца ў кіёсках за **1500 рублёў**. Столькі сама будзе каштаваць цана падпіскі аднаго нумару праз Рэдакцыю. Адпаведна, цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складзе ад красавіка **6000 рублёў**. Цана падпіскі праз «Белпошту» адпаведна знізіцца ад 1 ліпеня.

Не ўсё ў жыцці апошні раз!

**Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю.** Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**Вользе К.** з Прагі.
**Алесю З.** з Мастоўскага раёну.
**Г.К.** з Мінскага раёну.
**Аляксею Ш.** з Баранавіцкага раёну.
**Мікалаю Ш.**, **Валерыю Х.** з Салігорскага раёну.
**Сяргею Р.**, **Тамары Ш.** з Бярозаўскага раёну.
**В.Д.**, **Іне С.** з Барысаўскага раёну.
**Л.Ш**. з Віцебску.
**Яўгенію К**. з Шклоўскага раёну.
**Уладзіміру В.**, **С.Р.** з Гродна.
**А.П.** з Жлобінскага раёну.
**І.Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Д.К.** з Мастоўскага раёну.

Працяг са старонкі 1.

# Доўгія ўгаворы

Як потым паведаміла агенцтву «Інтэрфакс» прэс-сакратар прэзідэнта РФ Наталля Цімакова, была дасягнутая дамоўленасць, што 20 сакавіка — гэта значыць, проста на наступны дзень — будзе праведзеная сумесная калегія міністэрстваў фінансаў Расіі і Беларусі «для далейшага абмеркавання пытанняў прадстаўлення крэдытаў і выкарыстання іншых формаў эканамічнага ўзаемадзеяння». Такім чынам, яму не адказалі хутчэй «так», чым «не».

У Мінску міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын заявіў, што найбліжэйшым часам Беларусі будзе пераведзеная апошняя транша (500 мільёнаў даляраў) стабілізацыйнага крэдыту. А таксама разглядаюцца «іншыя формы падтрымкі».

Тым часам прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на сустрэчы з Кудрыным паведаміў, што Беларусь зацікаўленая ў больш актыўнай працы расійскага капіталу ў Беларусі. Кіраўнік ураду зазначыў, што прапрацоўваюцца праекты ўдзелу расійскіх інвестараў у малочнай галіне. Паводле «Камерсанта», на перамовах у Завідаве ў тым ліку падымалася пытанне прыватызацыі малочных прадпрыемстваў Беларусі.

Малакаперапрацоўчая галіна з'яўляецца адной з найбольш прыбытковых у Беларусі, а большая частка экспарту ідзе менавіта ў Расію. Разам з тым, яшчэ зусім нядаўна Лукашэнка ў Магілёве, наведваючы прадпрыемства «Бабушкина крынка», заяўляў, што дзяржава не мае намеру прадаваць падобныя прадпрыемствы.

Як паведамляе «Камерсантъ», на сустрэчы ў Цвярской вобласці таксама прысутнічаў намеснік начальніка «Газпрому» Аляксей Мядзведзеў. Справа ў тым, што Беларусь запазычылася «Газпрому» 70 мільёнаў даляраў. Мядзведзеў, які Аляксей, сказаў з усмешкай карэспандэнту «Комерсанта», што гэтую праблему ўдалося вырашыць. Якім чынам — не паведамляецца.

Пасля кабінетных перамоваў лідэры дзяржаваў пайшлі гуляць па рэзідэнцыі, дзе іх чакала барбекю, яны пілі гарбату на двары і грэліся ля вогнішча. Пры гэтым Лукашэнка быў апрануты ў вайсковы бушлат. Потым Лукашэнка накіраваўся дадому ў Мінск.

Як паведаміла БЕЛТА, сярод іншага ў Завідаве абмяркоўваліся стасункі паміж афіцыйным Мінскам і Еўрасаюзам. Напэўна, гэтае самае пытанне было адным з галоўных падчас другога раунду перамоваў між Лукашэнкам і Мядзведзевым, што нечакана прайшлі ў Краснай Паляне пад Сочы 21 сакавіка, праз два дні пасля Завідава. Тым больш што напярэдадні, 20 сакавіка, Еўрасаюз зрабіў афіцыйнае запрашэнне Беларусі ў праграму «Усходняга партнёрства». Афіцыйна паведамляецца, што кіраўнікі краін сустрэліся, каб «пагутарыць аб замежнапалітычных аспектах».

«Два дні назад мы абмяркоўвалі антыкрызісныя меры, эканоміку, але застаўся некаторы пакет пытанняў, які мы павінны абмеркаваць. Па замежнапалітычных аспектах, вядома, вельмі пажадана пагутарыць, каб не было ніякіх рознachытанняў», — цытуе агенцтва РІА «Новости» Лукашэнку.

Выглядае на тое, што Лукашэнку зноў угаворвалі прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, у адваротным выпадку страшачы зняць з крэдытнай іглы.

Тым часам міністр замежных справаў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў у Брусэлі, што Еўрасаюз аказвае ціск на Мінск у пытанні прызнання незалежнасці аддзеленых ад Грузіі дзяржаваў. А ў панядзелак Лукашэнка нават сустрэўся асабіста з прэзідэнтам Абхазіі Сяргеем Багапшам.

«Пасля набыцця незалежнасці заўсёды справаў дадаецца. Мы будзем радыя, што з удзелам Беларусі ўдасца вырашыць больш праблем, якія існуюць у гэтым рэгіёне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Багапша.

У Краснай Паляне Лукашэнка не ўпусціў магчымасці і пакатацца на лыжах. Гэта ўжо трэці зімовы курорт, дзе спыняецца беларускі кіраўнік цягам сакавіка.

**Зміцер Панкавец**

# Беларусь запрошаная ва «Ўсходняе партнёрства»

20 сакавіка на саміце кіраўнікоў краінаў Еўрасаюзу ў Брусэлі была зацверджаная праграма «Усходняга партнёрства». У лік шасці краінаў, на якія распаўсюджваецца праграма, чакана трапіла і Беларусь. Прычым, нашай краіне не высоўваліся ніякія ўмовы. Таксама ва «Усходняе партнёрства» запрасілі Азербайджан, Арменію, Грузію, Малдову і Украіну.

Афіцыйна ў сілу праграма ўступіць 7 траўня на саміце ў Празе. Пытанне пра запрашэнне Лукашэнкі ў чэшскую сталіцу ўсё яшчэ абмяркоўваецца.

Як адзначаецца ў Брусэлі, галоўнай мэтай праграмы з'яўляецца ўцягванне гэтай шасцёркі краін у эканамічную, палітычную і стратэгічную сферы ўплываў Еўрасаюзу.

Удзел Беларусі, Украіны і Малдовы ў праграме «Усходняга партнёрства» адкрывае перад краінамі перспектывы сяброўства ў Еўрасаюзе. Фактычна гэтыя краіны будуць валодаць тымі ж правамі, як Нарвегія, Ісландыя і Ліхтэнштэйн. Хіба што не будзе права голасу.

Галоўная выгада ад «Усходняга партнёрства» — ускосная, але гіганцкая. Гэта магчымасць свабоднага гандлю з краінамі ЕС.

Краіны «Усходняга партнёрства» вабяць таксама бязвізавым рэжымам — на індывідуальнай аснове. Зрэшты, далейшае супрацоўніцтва залежыць ужо ад саміх краін. Некалі Беларусь уступала разам з Польшчай у праграму NATO «Партнёрства дзеля міру». Аднак заходняя суседка ўжо дзесяць гадоў, як у паўночнаатлантычным альянсе. Падобным чынам падзеі могуць развівацца і зараз.

Афіцыйныя ўлады таксама віталі запрашэнне Беларусі ў праграму. Прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў адзначыў «недыскрымінацыйны характар прынятага рашэння».

А яшчэ ў той самы дзень кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей склікаў да сябе ўсіх паслоў Еўрасаюзу для абмеркавання далейшага ўдзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». Як паведаміла афіцыйная крыніца, «былі абмеркаваныя канкрэтныя кірункі супрацоўніцтва, якія ўяўляюць супольны інтарэс».

**ЗП**

# Інтрыгі вакол «Белсату»



Агнешка Рымашэўская.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Роўна тыдзень у статусе беспрацоўнай прабыла кіраўнічка незалежнага спадарожнікавага тэлеканалу «Белсат» Агнешка Рамашэўская. У мінулы аўторак яна была нечакана звольненая з пасады, а на яе месца прызначаная былая намесніца Беата Паклепа.

Прэзідэнт TVP Пётр Фарфал патлумачыў звальненне Рамашэўскай тым, што яна «публічна ігнаравала рашэнні Рады, у тым ліку на сустрэчах соймавых камісій, і выказвалася на старонках прэсы без належнага ўзгаднення, якога патрабуе закон ад 2006 году».

Паводле нашай інфармацыі, змены кіраўніцтва былі прадыктаваныя найперш асабістымі канфліктамі з Рамашэўскай. У знак салідарнасці з начальніцай абвясцілу пра сыход з каналу папулярны вядучы Павел Мажэйка.

Ужо 24 сакавіка пастанова аб звальненні Рамашэўскай была адкліканая. Сама Агнешка гэтак пракаментавала новае прызначэнне: «Сітуацыя вярнулася да нармальнасці. Я думаю, што для такога рашэння было шмат аргументаў. Польскае Міністэрства замежных спраў ціснула на гэта, людзі, прэса».

З заявай у абарону Рымашэўскай выступіла і грамадская рада пры «Белсаце» складзеная з беларускай інтэлігенцыі.

**ЗП**

## Сцісла

### Кангрэс еўрапейскіх сілаў

У верасні павінен адбыцца Кангрэс еўрапейскіх сілаў. Некалькі паседжанняў аргкамітэту па яго падрыхтоўцы ўжо прайшлі ў Мінску. У працы Кангрэсу маюць узяць удзел Партыя БНФ, «Малады фронт», БСДП (Народная грамада), «Хартыя-97», БХД. Таксама сярод імаверных удзельнікаў Рух за Свабоду і АГП. Аднак дзве апошнія структуры пакуль вычэкваюць. Цалкам імаверна, што на гэтым форуме будзе вылучаны кандыдат у прэзідэнты ад праеўрапейскіх сілаў.

### Машкевіч адхілены ад беларускіх справаў

Былы пасол Польшчы ў Беларусі Марыюш Машкевіч зняты з пасады намесніка дырэктара Усходняга дэпартаменту, куратара Беларусі ў польскім МЗС. На пасаду куратара Беларусі ў МЗС Польшчы прызначана Ганна Кастшэва. Машкевіч быў прыхільнікам дыялогу з беларускімі ўладамі і адначасовага падтрымання цесных кантактаў з апазіцыяй.

### Чэкістаў з нацыстамі параўноўваць можна

а ўсё астатняе — экстрэмізм. Рэдакцыя часопісу ARCHE атрымала матывацыйную частку рашэння Маскоўскага раённага суду Брэсту аб прызнанні аднаго з нумароў часопісу экстрэмісцкім. Паводле рашэння суду Маскоўскага раёну гораду Брэсту фраза «Саюзнікі — нацыст і чэкіст — схіліліся над мапай» з артыкулу Андрэя Расінскага (№7—8 ARCHE за мінулы год) не ўтрымлівае інфармацыі «з прыкметамі экстрэмісцкай скіраванасці». Тры іншыя артыкулы з таго ж нумару, на палітычную тэматыку, паводле суду такую інфармацыю ўсё ж нясуць. Выданне будзе абскарджваць рашэнне.

### Лукашэнка ўзнагародзіў беларускім ордэнам «За службу Радзіме» расійскага афіцэра

18 сакавіка падпісаны ўказ аб узнагароджанні ордэнам «За службу Радзіме» I ступені генеральнага інспектара Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі Міхаіла Майсеева.

**ЗП**

# Даляр ляціць уніз, еўра ўздымаецца ўсё вышэй

**На мінулым тыдні цягучае ўзмацненне даляра змянілася яго ж імклівым падзеннем.**

За пару дзён амерыканская валюта страціла тое, што патрошкі назапасіла за паўтара месяца. 2782 рублі — такія лічбы сустракаліся апошні раз у пачатку лютага.

Што стаіць за гэтымі падзеямі і чаго можна чакаць у найбліжэйшы час?

Галоўнай прычынай падзення курсу даляра сталася навіна пра закупку Федэральнай рэзервовай сістэмай ЗША (ФРС) дзяржаўных аблігацый на суму 300 мільярдаў даляраў. У апошні раз такія захады Белы Дом рабіў у 1960-я. Дзяржава выкупае ў насельніцтва аблігацыі і расплачваецца за іх «жывымі» далярамі. Грашовая маса рэзка павялічваецца, што выклікае меншую плацежную здольнасць валюты. А кіраўнікі ФРС нават не спрабуюць яе падтрымаць. У той жа час яны маўчаць пра свае найбліжэйшыя планы, што выклікае яшчэ большае адчуванне няпэўнасці ў тых, хто трымае зберажэнні менавіта ў амерыканскай валюце.

Паколькі ў планах ураду Барака Абамы ўкіданне на рынак трыльёна даляраў, то можна меркаваць, што даляр працягне падзенне. Гэта выгадна для амерыканскіх экспарцёраў, але падважвае статус даляра як асноўнай рэзервовай валюты.



На сустрэчы міністраў фінансаў і кіраўнікоў нацыянальных банкаў 20 найбуйнейшых эканомік свету загучалі заклікі да стварэння новай сусветнай валюты.

Міністры выказалі сумнеў наконт перспектываў даляра, і ўслед за гэтым еўра сігануў да недасяжных раней вышыняў. 3812 рублёў — новы рэкорд для беларускага рынку. Паляпшэнне бізнэс-клімату ў Германіі падтрымлівала на мінулым тыдні курс еўра стабільна высокім.

З меркавання аналітыкаў «Форэкс-клубу», суадносіны між далярам і еўра, якія цяпер складаюць 1,36, у найбліжэйшы час павялічацца да 1,37—1,40. Еўра ўжо знаходзіцца недалёка ад сваёй столі і хутка яго рост адносна іншых валют спыніцца.

Адно з магчымых дзеянняў Еўропы — пайсці шляхам амерыканцаў і пачаць выкупаць дзяржаўныя аблігацыі. Кіраўнікі еўрапейскай банкаўскай сістэмы пакуль ад гэтага варыянту адмаўляюцца, але інвестары патрабуюць рашучых крокаў усё больш настойліва.

Беларусы прынялі новыя курсы без панікі. Са словаў супрацоўніка аднаго з філіялаў «Беларусбанку», чэргаў з ахвотнымі здаць даляры і набыць еўра няма. «Некаторыя кліенты абураюцца, што і з далярам іх падманулі, як раней з рублём».

**Ягор Марціновіч**

# Канец афшораў ударыць па Беларусі

**У 2008 годзе афшорныя Швейцарыя з Кіпрам займалі 2 і 4 месцы адпаведна па колькасці замежных інвестыцый у Беларусь.**

Замежных інвестыцый, на якія так разлічваюць беларускія ўлады, можа паменець, бо ў свеце знікаюць афшорныя зоны. Між тым менавіта з іх прыходзіла львіная доля капіталаў у постсавецкія краіны.

Швейцарыя, у якой сканцэнтравана 27% сусветных прыватных укладаў, згадзілася даваць інфармацыю іншым краінам пра няплатнікаў падаткаў. Пра змякчэнне доступу да банкаўскай таямніцы заявілі таксама Аўстрыя, Ліхтэнштэйн, Андора, такія ж захады робяць Сінгапур і Ганконг.

Развітыя краіны выступаюць за скарачэнне колькасці афшорных зонаў. Яны спадзяюцца такім чынам зменшыць дэфіцыт бюджэту, павысіць падатковыя надыходжанні. Вярнуць грошы са своесаблівага падатковага раю — няпростая задача для любой дзяржавы. Сказаць, якія сумы маглі вывезці з Беларусі айчынныя бізнэсмэны, складана. Асноўная частка бізнэсу сканцэнтравана ў руках дзяржавы, таму наўрад ці мільярды.

Тым не менш, менавіта з афшорных зонаў ідзе вялікая частка інвестыцый у Беларусь.

Напрыклад, у 2007 годзе Швейцарыя займала ў рэйтынгу найбуйнейшых беларускіх інвестараў трэцяе месца, Кіпр — пятае. Брытанскія Віргінскія астравы, якія спыніліся на адзінаццатай прыступцы, уклалі ў нашу краіну больш за Польшчу, Чэхію, Швецыю.

**Брытанскія Віргінскія астравы ўклалі ў нашу краіну больш за Польшчу, Чэхію, Швецыю.**

У 2008 годзе Швейцарыя з Кіпрам выйшлі ўвогуле на 2 і 4 месцы адпаведна. З тэрыторыі Швейцарыі было ўкладзена 1,22 мільярда даляраў. Калі капітал пачне адток з гэтых краін, ім давядзецца спачатку як мінімум прайсці легалізацыю ў сябе на радзіме, што павінна замарудзіць інвестыцыі ў Беларусь.

**ЯМ**

# Дзяржава гатова прадаваць зямлю ў прыватную ўласнасць інвестарам

Прыватныя інвестары атрымаюць зямлю ў прыватную ўласнасць пры будаўніцтве асабліва значных аб'ектаў.

Праект Міністэрства эканомікі ўдакладняе, што статус «значных» атрымаюць праекты інвестыцый, якія складаюць 150 мільёнаў еўра і больш. Для харчовай і лёгкай прамысловасці будзе дастаткова і 50 мільёнаў еўра. Інвестарам будуць давацца падатковыя льготы, вызваленне ад выплат пошлін на тэхнічнае абсталяванне і іншыя палёгкі.

У адрозненне ад амбасадаў, якія могуць мець зямлю ва ўласнасці, на сёння замежныя юрыдычныя асобы маюць права толькі арандаваць беларускую зямлю. Хутчэй за ўсё так і будзе, беларускія інвестары змогуць атрымаць зямлю ў прыватную ўласнасць, а замежныя — арандаваць на пэўны час. Скептыкі зазначаюць, што ніхто не перашкодзіць дзяржаве неўзабаве аб'явіць нацыяналізацыю зямлі і забраць сабе рэалізаваныя праекты.

Згодна з наяўным зямельным кодэксам, перад продажам зямлі павінен праводзіцца аўкцыён. Але «ў іншых выпадках, усталяваных прэзідэнтам», магчыма адступленне ад правілаў і магчымы продаж зямлі без аўкцыёну. Відаць, краіна сутыкаецца з тым самым «іншым выпадкам».

У 1996 годзе на рэферэндум выносілася пытанне наконт продажу зямлі ў прыватную ўласнасць. Праўда, тады ішла гаворка менавіта пра землі для сельскай гаспадаркі. За ўвядзенне «вольнай без абмежаванняў куплі-продажу земляў сельскагаспадарчага прызначэння» прагаласавала толькі 15,35% выбарнікаў, «супраць» — 82,88%.

**ЯМ**

# Апазіцыя прапануе сваю Антыкрызісную праграму

**Яе галоўныя пункты — развязаць рукі прыватнай ініцыятыве і ўвесці рэжым эканоміі дзяржаўных грошай.**

Апазіцыя раіць правесці дэбюракратызацыю, адмовіцца ад дзяржаўнага планавання, стварыць у бюджэце Фонд антыкрызіснага рэагавання. Прапануецца перадаць мясцовым уладам магчымасць распараджацца падаткамі, сабранымі на сваёй тэрыторыі. Увядзенне рэжыму суцэльнай эканоміі ўключае адмову ад будаўніцтва АЭС, аграгарадкоў, спартовых збудаванняў, скарачэнне расходаў на саму ўладу.

Акрамя гэтых папулісцкіх захадаў, праграма, распрацаваная пры ўдзеле найлепшых незалежных спецыялістаў, прадугледжвае шэраг досыць канкрэтных мераў па стымуляванні прадукцыйнасці працы і фінансавай дысцыпліны.

Сканчваецца ж праграма традыцыйнай прапановай: «улада павінна сысці ў адстаўку як мага хутчэй».

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Сідорскі: Беларусь зацікаўлена ў актыўнейшай працы расійскага капіталу ў краіне

Аб гэтым заявіў Сяргей Сідорскі на сустрэчы з міністрам фінансаў Расіі Аляксеем Кудрыным. Паводле Сідорскага, абмяркоўваецца продаж расійцам малакаперапрацоўчай прамысловасці. «Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі пацвердзіла рух у энэргетычнай сферы, у частцы будаўніцтва беларускай АЭС», — сказаў прэм'ер-міністр. Акрамя таго, расійскія кампаніі цяпер вывучаюць прапановы беларускага боку па ўзаемадзеянні ў праектах нафтахімічнага комплексу.

### Кудрын не выключае ўгоды «своп» з Беларуссю

аналагічнай той, якая была праведзена паміж Беларуссю і Кітаем. Пра гэта заявіў міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын.

### Эміраты падвялі

Інвестыцыйная кампанія з Эміратаў адмовілася ад будаўніцтва лядовай арэны «Чыжоўка». Лукашэнка марыў адкрыць «Чыжоўку» ў 2011 годзе.

### Беларусь адмяніла экспартныя мытныя пошліны

Гэта будзе спрыяць прасоўванню айчынных тавараў на рынкі іншых краінаў. Паводле падлікаў дзяржаўных фінансістаў атрымліваецца, што адмена ўказу дазволіць беларускім прадпрыемствам вызваліць каля 3,5 мільёнаў даляраў.

### Нафта даражэе зноў

Нестабільнасць даляра прымушае інвестараў шукаць альтэрнатыўныя сродкі ўкладвання грошай. Нафта — адзін з такіх варыянтаў. Цяпер барэль каштуе больш за 50 даляраў.

**ЯМ; БЕЛТА, «Народная воля»**

# Масква прагне раскрышыць «Усходняе партнёрства»

**У суботу пад Сочы Мядзведзеў і Лукашэнка абмяркоўвалі тое, пра што не паспелі пагутарыць (ці, хутчэй, не дамовіліся) двума днямі раней ў Завідаве. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

«Па замежнапалітычных аспектах, вядома, вельмі пажадана пагутарыць, каб не было ніякіх розначытанняў», — дэманстратыўна засведчыў лаяльнасць Лукашэнка. Насамрэч, трэба думаць, ніякага жадання трымаць перад маскоўскімі таварышамі адказ за еўрапейскія справы ў госця не было.

Вожыку зразумела, што ўлучэнне Беларусі ва «Усходняе партнёрства» Маскве не пад нос. Суботні «Коммерсантъ» падае гэтую падзею пад красамоўным загалоўкам: «Еўрасаюз умяшаўся ў саюзныя справы Расіі». Залез, так бы мовіць, на кананічную тэрыторыю.

«Тое, што «Усходняе партнёрства» ў пэўнай ступені мае антырасійскую скіраванасць, — гэта сакрэт Полішынэля», — кажа беларускі палітолаг Андрэй Фёдараў. Ён адзначае, што Крэмль сур'ёзна ўзяў у абарот слабыя звёны новай праграмы ЕС — Малдову і асабліва Беларусь.

Аналітык лічыць вельмі імаверным, што мара Какойты з Багапшам збудзецца ўжо на пачатку веснавой сесіі палаты прадстаўнікоў.

Паводле задумы Масквы, прызнанне Мінскам самаабвешчаных каўказскіх рэспублік сапсуе маліну ў яго дачыненнях з Брусэлем, увальe ладную лыжку дзёгцю ў бочку «Усходняга партнёрства». Туды ж, не забывайма, запрасілі Грузію! Карацей, Лукашэнку не вып'шуць білет у Прагу, ён пакрыўдзіцца — і пайшло-паехала. «Кому война, а кому мать родна».

Тым часам расійскі міністр замежных справаў Лаўроў у Брусэлі зноў чыхвосціў чэшскага калегу Шварцэнберга (Чэхія, нагадаю, старшыніе ў ЕС). Нашто, маўляў, той ставіць суверэннай Беларусі ультыматумы, каб не прызнавала Паўднёвую Асецію з Абхазіяй?

Дарэчы, аўтар гэтых радкоў таксама не надта разумее, чаму хітрамудрыя еўрасаюзаўскія дзеячы так дубова паводзяць сябе акурат у тым пытанні, у якім беларускі афіцыйны кіраўнік падпаў пад найбольшы ціск Масквы. Тым самым яны толькі распальваюць яе спартовы інтарэс: даціснуць!

Еўропе куды слушней было б найперш патрабаваць ад Лукашэнкі, каб адкручваў гайкі ўнутры краіны, дзе ён поўны гаспадар і дзе каліва лібералізацыі не такое ўжо і пагрозлівае для сістэмы.

Калі ж Мінск упрэцца рогам у пытанні мяцежных правінцый, то Масква проста закруціць кранік. У кабінетах ЕС не могуць не разумець гэтай форс-мажорнасці для Лукашэнкі — і ўсё адно педалююць тэму. Нашто? Каб потым яшчэ раз пачувацца як мыла з'еўшы?

Згадайма: перад восеньскімі выбарамі дзяўблі: развіццё дачыненняў магчымае толькі пры ўмове, што парламент будзе абраны дэмакратычна, празрыста. Атрымалі анучай па твары — выцерліся і... прыпынілі санкцыі супраць чыноўнікаў. Перад самітам 19—20 сакавіка таксама гучаў рэфрэн: болей рэформаў і ўсё такое. Ніякіх саступак не дачакаліся — і ўсё адно ўлучылі «апошнюю дыктатуру» ў новы праект, бо гэта было ўжо запраграмавана.

Тым болей давядзецца выцерціся, калі пад Сочы Лукашэнку змусяць ужо ў найбліжэйшыя дні парадаваць Багапша ды Какойты. У Брусэля няма іншага выйсця, акрамя як праглынуць пігулку.

Увогуле ж, кладучы руку на сэрца, неба на зямлю не ўпадзе. Пытанне мае сімвалічную, а не рэальную геапалітычную вагу. І потым, не сталі ж выкідаць з «Усходняга партнёрства» Азербайджан, дзе Аліеў толькі што, лічы, аформіў сабе пажыццёвае цараванне!

Дарэчы, што да прызнання/непрызнання. Вось вам красамоўны працэс, што распачаўся днямі ў «мяккай падбрушыне» Еўропы. Сербія з Харватыяй рэзка ўзяліся ўлагоджваць стасункі, здавалася б, безнадзейна сапсаваныя пасля таго, як летась Заграб прызнаў Косава. Жыццё бярэ сваё. Харватыя, дарэчы, паабяцала Сербіі паспрыяць у набліжэнні да ЕС.

Дадамо: сам Еўрасаюз у спрэчным косаўскім пытанні раскалоты ў прапорцыі 22:5. Іспанія, напрыклад, сытая па горла сепаратызмам баскаў і каталонцаў, катэгарычна супраць прызнання Прышціны. І не цягаюць жа еўрапейскія лідэры праз гэта адзін аднаго за чубы на самітах! :)



Ну а тэму «Беларусь і прызнанне каўказскіх рэспублік» некаторыя дзеячы Еўрасаюзу акцэнтуюць, як падаецца, яшчэ і таму, што за кошт гэтага можна эфектна абмаляваца ў вачах еўрапейскіх бюргераў, напалоханых леташняй вайной на Каўказе.

Звыш за тое, еўрапейскія палітыкі хапаюцца за тое, што на паверхні, на вуснах абывацеляў, бо не маюць прадуманага спісу патрабаванняў да беларускага боку. Той самай дарожнай карты, пра якую яшчэ з восені дзяўблі аналітыкі.

Пра рэальныя вынікі размоваў пад Сочы мы даведаемся найхутчэй што праз некалькі дзён. Адно што без «розначытанняў», пра непажаданасць якіх заявіў Лукашэнка, у любым выпадку не абыдзецца і надалей.

Калі хочаце, менавіта на «розначытаннях» ён будуе ўсю сваю палітыку манеўравання між Масквой і Брусэлем.

І, рызыкнем спрагназаваць, не адмовіцца ад яе, нават калі ў пытанні мяцежных правінцый капітулюе (што яшчэ не факт). Дарэчы, гэты прэсінг лішні раз паказвае яму, як важна мець еўрапейскі тыл.

Еўропа ж магла б болей тонка скарыстоўваць гэтыя інтарэс і болей прадумана выбіраць пункты, на якія варта дазавана, але сістэмна ціснуць. Бог з імі, тымі каўказскімі справамі! Нам важней, каб нешта мянялася ў Беларусі.

# «Коммерсантъ»: Расія многа хоча за працяг фінансавання Лукашэнкі

**Расійскія СМІ пагражаюць, што газ Беларусь увесь год будзе купляць па 210 даляраў, а новы крэдыт улады не атрымаюць. З іншага боку, Расія гатовая перадумаць узамен беларускай малакаперапрацоўкі і датэрміновага «Белтрансгазу».**

Нешта экстраардынарнае рыхтуецца ў адносінах Расіі і Беларусі. Іначай нашто былі б аж дзве незапланаваныя сустрэчы Дзмітрыя Мядзведзева і Аляксандра Лукашэнкі за тыдзень, спачатку ў падмаскоўнай рэзідэнцыі «Завідава», а пасля на лыжах у Сочы.

Блізкая да «Газпрому» маскоўская газета «Коммерсантъ» піша, што за тры гадзіны зносінаў (БЕЛТА гаворыць пра сем гадзінаў) у Завідаве расійскаму боку ўдалося адгаварыць Лукашэнку браць у Масквы крэдыт памерам 100 млрд руб. (каля $3,5 млрд), угаварыць яго плаціць $210 за тысячу кубаметраў расійскага газу і, магчыма, прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію.

Адзін з высокапастаўленых супрацоўнікаў адміністрацыі прэзідэнта РФ у інтэрв'ю журналістам заявіў: «Грошы, якія яны ад нас чакаюць, павінныя пайсці на выплаты пенсій, дапамогаў, карацей, на выкананне сацабавязанняў. Але нас зусім не цешыць, што беларускія ўлады займаліся папулізмам за наш кошт. Думаю, ніякіх грошай мы ім не дамо».

Вось гэтае «думаю» наводзіць на думку, што магчымасць атрымаць грошы такі ёсць.

«Ці знайшліся ў вас у выніку 100 млрд для Аляксандра Лукашэнкі?» — пацікавіліся журналісты ў міністра фінансаў Кудрына на выхадзе з перамоваў.

«Пытанне прадастаўлення Беларусі крэдыту вы-ву-ча-ец-ца»,— адказаў Кудрын.

Апошняе слова ён вымавіў па складах, не ўдакладніўшы, як доўга будзе разглядацца беларуская заяўка і ці будзе па ёй прынятае станоўчае рашэнне ў выпадку прызнання Мінскам незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Паведаміўшы напрыканцы, што РФ і Беларусь рыхтуюць дамову аб рублёвых разліках за энэргарэсурсы, Аляксей Кудрын адбыў у Маскву.

Як высвятліў «Коммерсантъ», у першым квартале гэтага году беларускія ўлады зрабілі выгляд, што не заўважылі падвышэння кошту на газ з $128 да $210 за тысячу кубаметраў і аплацілі пастаўкі па ранейшым тарыфе. У выніку за два зімовыя месяцы Мінск стаў вінен «Газпрому» каля $70 млн, што пачынала нерваваць расійскую манаполію. Аднак, як распавёў намеснік кіраўніка газавага канцэрну Аляксандр Мядзведзеў, перамовы ў Завідаве вырашылі ўсе праблемы.

«Мы аб усім дамовіліся і знялі ўсе няўвязкі»,— паведаміў Мядзведзеў.

Бакі ўмовіліся, што хуткім часам «Газпром» давядзе сваю частку ў братэрскім «Белтрансгазе» да абумоўленых 50% акцый (у студзені «Газпром» разлічыўся за чарговыя 12% і цяпер яму належыць 37,5%). Такім чынам, і газавае пытанне пакуль можна лічыць закрытым.

Акрамя таго, як паведаміў «Коммерсанту» чыноўнік, які таксама пабыў за зачыненымі дзвярыма і які не пажадаў адкрыць свайго імя, на перамовах Масква падняла пытанне аб прыватызацыі расійскім капіталам малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі і амаль яго вырашыла. Працоўная група, якая складзе спіс прывабных для расійскага бізнэсу аб'ектаў, можа прыступіць да працы ўжо ў пачатку красавіка. Больш за тое, літаральна на днях у Мінск накіруецца Сечын, які абгаворыць там «сумесныя інвестыцыйныя праекты» ўжо ў нафтавай сферы.

Іншымі словамі, Аляксандру Лукашэнку ўсё ж пакінулі надзею. Апраўдаецца яна ці не, шмат у чым залежыць ад таго, як пройдзе сесія беларускага «парламенту», якая пачнецца 2 красавіка, на якую будзе вынесена пытанне Абхазіі і Асеціі. Нагадаем, што дагэтуль «незалежнасць» захопленых Масквой тэрыторый прызналі толькі Нікарагуа і рух «Хамас».

**МБ, паводле «Коммерсанта»**

# Мур: ЗША ў МВФ галасавалі супраць крэдыту Беларусі

— Нас прасілі пра выдачу крэдыту ў рамках двухбаковых адносінаў. Беручы пад увагу існую гаспадарчую сітуацыю, мы не выдаем двухбаковых крэдытаў. Як і ў выпадку з іншымі краінамі, мы парэкамендавалі Беларусі з пытаннем пра крэдыт звярнуцца ў Міжнародны валютны фонд. Мы спадзяваліся, што крэдыт МВФ будзе прывязаны да структурных эканамічных рэформаў у Беларусі. Паколькі мы не бачылі гэтых умоваў для выдачы крэдыту з боку МВФ, Злучаныя Штаты галасавалі супраць вылучэння гэтага крэдыту. У нас няма права «вета», мы ўсяго толькі адна з краінаў, якая бярэ ўдзел у галасаванні.

**З інтэрв'ю Charter97.org**

# Белтэст

«Нарэшце!» Гэта быў ці не першы водгук, які давялося прачытаць у інтэрнэце адразу пасля таго, як з пасады дырэктаркі «Белсату» была звольнена Агнешка Рамашэўска. Сітуацыю на «Белсаце» аналізуе **Віталь Тарас**.

На жаль, клічам «Нарэшце!» вычэрпваецца змест вельмі значнай часткі ананімных водгукаў на падзею. (Падобныя водгукі з'явіліся не толькі на сайце «Нашай Нівы», але і на іншых сайтах — радыё «Свабода», Хартыя-97 і г.д.) Вось яшчэ некалькі — «Шэры, нецікавы канал», «Белсат» не глядзеў і не буду глядзець, бо ён нікому не патрэбны». Цытую не даслоўна, але паводле сэнсу. Адзін з аўтараў водгукаў абураецца, што больш за тузін яго знаёмых працуюць у розных СМІ ў Польшчы замест таго, каб прыносіць карысць Беларусі.

Не буду ацэньваць дзеянні ці выказванні польскіх чыноўнікаў, у тым ліку, кіраўніцтва TVP, а таксама маўчанне МЗС, якое на тры чвэрці фінансуе «Белсат». Гэта справа польскіх палітыкаў. Было б дзіўна папракаць у адсутнасці салідарнасці краіну, дзе нарадзілася «Салідарнасць», якая адолела камуністычную сістэму.

Мяне больш цікавіць рэакцыя на падзею ў самой Беларусі.

Зразумела, негатыўныя, ці, насамрэч, радасныя водгукі (кшталту — ура, у суседа карова здохла!) у белнэце не абавязкова адлюстроўваюць грамадскую думку ў поўнай меры. Але звернем увагу на тое, што наведнікі згаданых вышэй сайтаў ёсць на сённяшні дзень асноўнай мэтавай аўдыторыяй вяшчання незалежнага беларускамоўнага тэлеканалу.

Ці не ёсць?

### Завышаныя чаканні

Адназначна адказаць на гэтае пытанне складана, бо ўражанне такое, што кіраўніцтва каналу так і не вызначылася пакуль, на якую менавіта аўдыторыю ён вяшчае. Сказаць, што «Белсат» разлічаны на ўсіх беларусаў — гэта ўсё адно што сказаць: ён вяшчае ў пустэчу. Насамрэч, гэта, канечне, не так. Вялікая колькасць музычных перадач з удзелам рок-музыкаў, а ў яшчэ большай ступені — удзел маладых беларускіх журналістаў ва ўсіх перадачах сведчыць пра тое, што канал арыентуецца найперш на моладзь. Але выходзіць, што не ўсім маладым гледачам у Беларусі гэта падабаецца. І гэта можна зразумець. Ад «Белсату» многія гледачы (і не толькі маладыя, што было б зразумела) чакалі ледзве не рэвалюцыйнага прарыву. Вось пачне тэлебачанне з-за мяжы казаць праўду пра тое, што адбываецца ў Беларусі, і ўвесь народ выйдзе на вуліцы шчыльнымі радамі. Некаму, відаць, дагэтуль хочацца, каб так сталася. Але так не бывае і не мусіць быць. Не можа ніякае, нават самае суперсучаснае тэлебачанне ўнесці ў грамадскую свядомасць тое, чаго ў ім няма, да чаго грамадства не гатова.

Пры канцы 1970-х — на пачатку 1980-х палякі прагна слухалі радыё «Свабодная Эўропа». Слухалі ў тым ліку і цяперашняга польскага сенатара Збігнева Рамашэўскага, аднаго са стваральнікаў Камітэту абароны рабочых і незалежнага радыё «Салідарнасць», бацькі Агнешкі Рамашэўскай. Бо ў гэтым была грамадская патрэба. Людзі прагнулі пачуць вольнае слова.

Цяперашняе радыё і тэлебачанне працуе ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Праз спадарожнік «Хотбёрд» можна глядзець не толькі «Белсат», але больш за тысячу розных каналаў, пераважна забаўляльных. Дый БТ намагаецца не адставаць ад іншых — паказвае часам даволі якаснае кіно, папулярныя тэлесерыялы, забяспечвае трансляцыі найбольш цікавых спартыўных спаборніцтваў. Гэта адпавядае густам і патрэбам пераважнай большасці беларускіх гледачоў, ці, дакладней сказаць, — спажыўцоў тэлепрадукцыі. І гэта рэальнасць, якую нельга не ўлічваць.



Стылістка робіць макіяж і падбірае вопратку вядучым. На фота — да эфіру рыхтуецца Аліна Коўшык.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Шэсць гадзін па-беларуску

Ці слушна паступае «Белсат», калі паказвае тэлесерыялы кшталту «Элі Макбіл» ці «Ранча», які меў поспех у Польшчы? І так, і не. З аднаго боку, канал павінен прыцягваць і таго гледача, які аддае перавагу серыялам. Але ж ці вывучалі яго стваральнікі тэлеаўдыторыю ў Беларусі? І калі вывучалі, дык ці ўлічваюць на канале перавагі і густы менавіта беларускіх гледачоў, большасці з якіх праблемы амерыканскіх юрыстаў, напрыклад, могуць падацца нясмешнымі і нават дзіўнаватымі.

Вельмі спецыфічная аўдыторыя і ў дакументальнага кіно. З аднаго боку, на Захадзе гэта стала ўжо ўсеагульным трэндам — там дакументальныя фільмы, асабліва на грамадскім тэлебачанні, карыстаюцца вялікай папулярнасцю. У беларускага гледача няма пакуль такой звычкі. Ды часам не хапае і сур'ёзнага прафесійнага адбору ў выбары дакументальных фільмаў. З'яўленне многіх фільмаў носіць выпадковы характар. Уражанне такое, што на тэлеканале ўвогуле няма праграмнай палітыкі. Перадачы паміж сабой часта ніяк не стыкуюцца — ні паводле логікі, ні хаця б з дапамогай рубрык, якія б стварылі штодзённую структуру праграмы. Якія перадачы ідуць упершыню, а якія паўтараюцца ў трэці-чацверты раз, недасведчанаму гледачу даведацца немагчыма. А якая ж тэлепраграма без прэм'ераў і без іх наступнага абмеркавання ў студыі?

Але спыню пералік недахопаў. За той нядоўгі час, які канал існуе, з'явіліся ў яго, на маю думку, і дасягненні. Па-першае, моцна прыбавілі ва ўзроўні стваральнікі перадачы навінаў «Аб'ектыў». Геаграфія выпускаў становіцца ўсё больш разнастайнай. Большасць сюжэтаў рыхтуецца аператыўна, усё больш наўпроставых уключэнняў, інтэрв'ю, апытанняў, каментароў. І гэта пры адсутнасці афіцыйнай акрэдытацыі карэспандэнтаў! А ў маладога вядоўцы Алеся Залеўскага ягонаму ўменню трымацца ў кадры, задаваць пытанні, весці інтэрв'ю адразу з некалькімі суразмоўцамі варта павучыцца, думаю, многім прафесіяналам старэйшага веку.

### Альтэрнатывы няма

Ну, і нарэшце ёсць адна найважнейшая перавага «Белсату». Гэта шэсць гадзінаў вяшчання па-беларуску штодня. Не так важна нават, ці глядзіць нехта гэты канал усе шэсць гадзін запар. Не сакрэт, што многія ўключаюць тэлевізар на ўвесь вечар і могуць слухаць яго як радыё, як фон, займаючыся хатнімі справамі, часам у суседнім пакоі. І вось гэты беларускі фон, кантэкст дарагога каштуе. Ніводзін канал з тых, што ідзе ў Беларусі, не дае такога. Выпускі навінаў культуры на канале «Лад» ці навіны Мінскай вобласці ў разлік не ідуць.

Фактычна, на сёння беларускамоўнаму каналу «Белсат» проста няма альтэрнатывы. Што не азначае, што яго праграмы не трэба ўдасканальваць, як і якасць мовы, асабліва, пры перакладзе з замежных моваў.

Хацелася б, каб Назіральная рада каналу (сябры якой разгубіліся, атрымаўшы навіну пра знішчэ, а пасля — вяртанне дырэктаркі), мела б надалей хоць нейкія рэальныя паўнамоцтвы, а не была сходам «вясельных генералаў». Аўтарытэт старшыні Генадзя Бураўкіна, іншых сяброў рады занадта высокі, каб можна было яго растрачваць.

І тут мы вяртаемся да пачатку размовы. Польскі бок, з тэрыторыі якога вядзецца вяшчанне, мае правы, вядома, эканоміць на ўсім, у тым ліку і на вяшчанні для беларусаў. Але варта памятаць, што гісторыя незалежнай Беларусі не заканчваецца сённяшнім днём, як і будучыя яе адносіны з Польшчай.




Белсат займае ўсяго некалькі пакояў. Гэты — самы вялікі, у ім працуюць журналісты і запісваюцца спартовыя навіны. На галоўным плане — вядучы «Аб'ектыву» Алесь Залеўскі.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# «Працэс чатырнаццаці»: Дзе цяпер яго ўдзельнікі?

**Арышт Арцёма Дубскага ўзняў новую хвалю цікавасці да ўдзельнікаў «Працэсу чатырнаццаці». У красавіку, траўні і снежні летась суд Цэнтральнага раёну сталіцы пакараў 14 маладзёнаў за ўдзел у прадпрымальніцкай акцыі 10 студзеня. Большасць з іх (11 чалавек) былі асуджаныя да абмежавання волі без накіравання ва ўстановы адкрытага тыпу, так званай «хатняй хіміі», двое — да штрафаў, Андрэй Кім трапіў у калонію. Чым цяпер займаюцца маладзёны? Як склаўся іх лёс пасля прысудаў? Карэспандэнт «НН» паразмаўляў з удзельнікамі «Працэсу чатырнаццаці».**

Пачнем усё з таго ж **Арцёма Дубскага**. Пасля прысуду хлопец з'ехаў у родныя Асіповічы. Займаўся раздрукоўкай і наборам тэкстаў. Пасля таго, як на хлопца завялі новую крымінальную справу за ўхіленне ад адбыцця пакарання, ён з'ехаў ва Украіну. У суседняй краіне Дубскі прабыў толькі пару месяцаў. 13 лютага «маладафронтаўца» арыштавалі ў Го-



мелі, калі хлопец ехаў у Мінск на вулічную акцыю да Дня святога Валянціна. З таго моманту Дубскі знаходзіцца за кратамі. 3 сакавіка над ім ужо адбыўся адзін з двух запланаваных крымінальных судоў — па нібыта скрадзенай сімцы. Справу закрылі, але Арцёма не вызвалілі. Цяпер ён чакае наступнага працэсу — паводле артыкулу 415 КК («Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі»).

Паводле таго самага артыкулу крымінальная справа была заведзеная супраць аднаго непаўналетняга ўдзельніка справы **Максіма Дашука**. Праз свой узрост і адсутнасць мінскай прапіскі хлопец так і не змог



уладкавацца на працу, таму фактычна знаходзіўся пад хатнім арыштам. З дому яму дазвалялася выходзіць толькі на дзве гадзіны ў суткі — ад дзесятай да дванаццатай раніцы.

Вясной у Максіма памёр бацька, таму яму часта даводзілася дапамагаць маці, якая працуе прадпрымальніцай. Міліцыянты вынеслі Дашуку чатыры папярэджанні. Адну ноч хлопец правёў у следчым ізалятары, пасля чаго пракурор памяняў меру стрымання на падпіску аб нявыездзе. Калі пройдзе суд, яшчэ невядома. Паводле 415 артыкулу Дашуку пагражае да трох гадоў зняволення.

**Андрэй Кім** адзіны, хто быў асуджаны да зняволення ў рамках «Працэсу чатырнаццаці». Ён атрымаў паўтара году калоніі нібыта за збіццё супрацоўніка ДАІ Сычова. Тэрмін актывіст адбываў у бабруйскай турме, адкуль быў вызвалены 19 жніўня пад



ціскам заходніх краін.

Па вызваленні Андрэй не зменшыў свайго ўдзелу ў палітычным жыцці, яго можна ўбачыць амаль на кожнай акцыі апазіцыі. Таксама Андрэй стаў адным з сузаснавальнікаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

**Аляксандр Баразенка** таксама прасядзеў нейкі час у СІЗА на Валадарскага. Ён быў апошнім фігурантам працэсу. Справа ў тым, што Баразенка з'ўляўся студэнтам першага курсу факультэту паліталогіі Вроцлаўскага ўніверсітэту. На суд ён прыняў рашэнне не прыязджаць, але ў кастрычніку, адчуваючы нейкую віну перад сваімі паплечнікамі, Аляксандр добраахвотна з'явіўся да следчага. Паўтара месяца да суду ён правёў за



кратамі.

Суддзя Наталля Вайцяховіч пакарала маладзёна годам абмежавання волі. «Хімію» Баразенка пачаў адбываць толькі пару тыдняў таму. Дарэчы, адбывае ён яе не дома ў Пінску, а ў сталіцы, бо засталася мінская прапіска яшчэ з студэнцкіх часоў. Працуе грузчыкам на прадпрыемстве «Скайфрут». «Праца нялёгкая, але я прывык да цяжкасцяў. Грамадскую дзейнасць не кідаю», — кажа А.Баразенка.

Тэрмін ягонага пакарання скончыцца першым, ужо напрыканцы жніўня. Што будзе рабіць потым, яснасці яшчэ няма, бо не зразумела, ці прымуць яго назад на навучанне па праграме Каліноўскага. Не выключае варыянту, што будзе паступаць у адзін з беларускіх ВНУ.

**Міхаіл Пашкевіч** працуе ў выканкаме АГП, займае пасаду начальніка ўпраўлення па працы з рэгіёнамі. Менш актыўным у палітычным жыцці Пашкевіч не стаў. Як быў заў-



важны на вулічных акцыях, так і застаецца. А чаго толькі варты ягоны выступ на з'ездзе БРСМ, куды хлопец патаемна трапіў разам з Франакам Вячоркам.

У лютым Міхаіл Пашкевіч узначаліў моладзевае крыло АГП — «Маладых дэмакратаў». Літаральна на наступны дзень Міхаіла адмовіліся аднаўляць на гістфаку БДУ, адкуль яго выключалі на апошнім курсе літаральна за некалькі тыдняў перад абаронай дыплому. Цяпер спаслаліся на тое, што няма вольных месцаў. У пачатку сакавіка Пашкевіч атрымаў ад міліцыі першае папярэджанне, бо ў вызначаны час не быў дома.



**Алесю Стральцову** пашанцавала ўжо пасля прысуду ўладкавацца на працу па спецыяльнасці ў закрытае акцыянернае таварыства «ТВК». Працуе ў сферы замежнай эканамічнай дзейнасці, займаецца закупкай посуду за мяжой.

«Літаральна на наступным тыдні ў мяне намячаецца рабочая паездка ў Турцыю, каб правесці перамовы з партнёрамі. Пакуль не зразумела, ці выпусцяць мяне за мяжу. Завёз ужо ў міліцыю цэлую кіпу папер, можа, і дазволяць», — кажа А.Стральцоў.

Увогуле ж, у міліцыі хлопец адзначаецца раз на два тыдні. Папярэджанняў не было. Палітычную актыўнасць Стральцоў крыху абмежаваў. Як кажа, зусім не з прычыны «хіміі», а хутчэй тых працэсаў, якія адбываюцца ў БСДП.

**Алесь Чарнышоў** працуе ў адным



грамадскім аб'яднанні, якое займаецца гуманітарнай дзейнасцю. «Звычайная «хімія», нічым не лепшая і не горшая, чым у астатніх, думаю», — кажа А.Чарнышоў. Праблемаў з міліцыяй у яго не было, на акцыі ходзіць перыядычна.

«Адзіны непрыемны момант, які адбыўся, дык гэта тое, што давялося забраць дакументы з універсітэту. Летам паступлю ва ўніверсітэт культуры на факультэт культуралогіі, але дзённае навучанне не прадугледжваецца падчас адбыцця «хіміі», — гаворыць А.Чарнышоў.



**Міхаіл Субач** працягвае займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю разам з жонкай. «Грамадскую дзейнасць на дадзены момант абмежаваў», — кажа «хімік». Тым больш, дзіця нядаўна нарадзілася.

**Павел Вінаградаў** працуе слеса-



рам на фірме. «Праверак няма. Усё спакойна», — гаворыць хлопец.

Некаторыя ж фігуранты справы з'ехалі з краіны. Напрыклад, у Маскве цяпер жыве **Аляксей Бондар**.

«Пасля прысуду жыццё істотна змянілася, бо трэба было шукаць аф-



іцыйнае працаўладкаванне, але браць на працу «крымінальніка», з якім могуць быць праблемы не вельмі і хацелі. Крыху спадзяваўся спачатку на рэакцыю міжнароднай супольнасці. Але бліжэй да касацыйнага абскарджвання я разумеў, што трэба нешта рабіць, спадзявацца толькі на сябе. У той момант і пачалі з'яўляцца думкі аб пераездзе ў Кіеў ці ў Маскву. Чаму гэтыя гарады? Бо не хацеў прасіць палітычны прытулак, усё ж мне не пагражала фізічнае знішчэнне. Спыніўся ў апошні момант на Маскве. Канечне, думаць аб пераездзе было цяжка, але ўсё вырашылася літаральна за тыдзень, так што не было шмат часу вагацца. У Расіі займаюся выкываннем, працую, падтрымліваю сувязі з апазіцыйным расійскім асяроддзем, займаюся па магчымасці беларускімі справамі», — кажа А.Бондар.

**Тацяна Цішкевіч** цяпер навучаец-



ца па праграме Каліноўскага ў Акадэміі фізічнага выхавання ў Вроцлаве, на трэнера па конным спорце. У Беларусі Тацяна вучылася на аналагічнай спецыяльнасці, але пасля зняволення на Акрэсціна Цішкевіч адлічылі з ВНУ.

«Думала пра магчымасць паехаць вучыцца за мяжу на працягу трох месяцаў, але вырашылася канчаткова толькі за два дні да ад'езду. За дзень да разгляду нашай касацыйнай скаргі, не вытрымала. Не шкадую, што з'ехала, трэба толькі пачакаць. Першы час было вельмі цяжка, нават плакала, калі нехта пытаўся пра Беларусь. Цяпер ужо стала лягчэй», — кажа



Т.Цішкевіч.

Звязацца з **Міхаілам Крывавым** не атрымалася. Паводле нашых звестак, хлопец з'ехаў працаваць у Ірландыю.



Таксама двое ўдзельнікаў працэсу былі асуджаныя да штрафаў — **Антон Койпіш** і **Уладзімір Сяргееў**. Першы



цяпер займае пасаду адказнага сакратара «Моладзі БНФ», другі — займаецца стварэннем руху «Маладая Беларусь», а таксама працуе токарам на МТЗ.

**Зміцер Панкавец**

# 200 чалавек пісалі беларускую дыктоўку ў Гродне

22 сакавіка ў Гродне прайшла сімвалічная Агульнанацыянальная беларуская дыктоўка. Такія дыктоўкі ладзяцца ўжо другі год, удзел у іх — сведчанне павагі да роднай мовы. Пісаць сабралася поўная зала ахвотных, больш за 200 чалавек. Арганізавалі імпрэзу Таварыства беларускай школы і гарадзенскі Рух за свабоду, дыктавала Зінаіда Бандарэнка.

**Хрысціна Марчук, фота аўтара**



У якасці тэксту дыктоўкі арганізатары выбралі ўрывак з твора Рыгора Барадуліна «У хаце на куце жыў Бог». Дыктуе Зінаіда Бандарэнка.



Немалая зала таварыства «Палоніка» ледзь умясціла ўсіх ахвотных, якіх было больш за 200.



— «Чаму гэтыя дарослыя так марудна пішуць?..» Традыцыяй стала прыходзіць на дыктоўку сем'ямі.



Акцыя скончылася святочным тортам.

## Жулікі запрашаюць ў Польшчу за 200 еўра

### Тыя, хто купіў падробныя запрашэнні, трапляюць у Польшчы пад суд.

Запрашэнні польскіх працадаўцаў сталі хадавым таварам для былых прадпрымальнікаў, якія зацікаўленыя ў працы на беларуска-польскай мяжы.

З 2007 года ў Польшчы дзейнічае спрошчаная працэдура часовага працаўладкавання для грамадзян з сумежных дзяржаваў: Беларусі, Расіі, Украіны. Вынаходлівыя людзі хутка зразумелі, што атрымаць шматразовую працоўную візу стала прасцей, чым гасцявую, бо далёка не кожны мае сваякоў у Польшчы.

Пры падачы дакументаў на працоўную візу польскія дыпламаты патрабавалі ад замежнікаў толькі фармальны ліст працадаўцы аб прадастаўленні працоўнага месца. Ранейшае патрабаванне аб дазволе мясцовых уладаў адмянілі.

Гэтым фактам хутка скарысталіся прадпрымальныя грамадзяне, якія наладзілі новы від «бізнэсу» — актыўна пачалі прадаваць запрашэнні польскіх працадаўцаў. «Пуцёўкі ў новае жыццё» сталі распаўсюджваць ля польскіх консульстваў у Брэсце і Гродна. Цэны даходзяць да 200 еўра за запрашэнне. Гандаль запатрабаваны, бо ў прымежных гарадах заўсёды было шмат ахвотных наведваць суседнюю дзяржаву.

Такім чынам, значна вырасла колькасць так званых «супрацоўнікаў», якія паехалі ў Польшчу па набытых запрашэннях. Адпаведна вырасла і колькасць разбіральніцтваў у раённых судах Падляскага ваяводства. На лаве падсудных аказаліся тыя, хто змог на працягу некалькіх месяцаў перасячы беларуска-польскую мяжу ад 80 да 100 разоў, маючы ў пашпарце толькі працоўную візу, хоць гэтая віза можа выкарыстоўвацца выключна ў мэтах працаўладкавання за мяжой. Тым, хто рызыкуе, варта ведаць, што Крымінальны кодэкс Польшчы тлумачыць гэта як наданне ілжывай інфармацыі службовым асобам краіны, у дадзеным выпадку консулам і памежнікам. Пакаранне за дадзенае правапарушэнне прадугледжвае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**Адар'я Гуштын**

## Пражэктарпэрысхілтан: У крызіс Лукашэнка эканоміць на няньцы

У папулярнай праграме расійскага ОРТ абмеркавалі візіт беларускага лідэра з сынам у Ерэван. Вядучыя праграмы — гумарысты Ургант, Цэкала і Светлакоў — зрабілі выснову, што Лукашэнка ў крызіс эканоміць на няньцы, і назвалі яго вусатым нянем.

З праграмы, паказанай у Беларусі на канале АНТ, жарт пра сына Лукашэнкі выразалі.

**МБ**

## Яшчэ адзін «чорны спіс»

### У Віцебскай вобласці такі склалі з п'яніцаў.

Уладаў Віцебшчыны прапанавалі складаць спісы тых, каму не трэба прадаваць алкагольныя напоі ў крамах. Спісы рыхтуюць участковыя.

Каб атрымаць «чорную метку», нецвярозаму чалавеку дастаткова патрапіцца на вочы начальству ў працоўны час. Такія меры ўжо дзейнічаюць у Пастаўскім і Докшыцкім раёнах.

**ДГ**

## Арамнаў ашчадзіць для краіны 100 тысяч даляраў

Алімпійскі чэмпіён у цяжкай атлетыцы Андрэй Арамнаў пазбаўлены прэзідэнцкай стыпендыі. Прычына — ДАІ двойчы лавіла спартоўца нецвярозым за рулём. Стыпендыя — 5 500 даляраў штомесяц — мела выплачвацца яму на працягу 2 гадоў. Агульная ўзнагарода Арамнава за алімпійскае золата магла скласці 240 тысяч даляраў. З іх 110 тысяч былі выплачаны адразу, непасрэдна за медаль.

**ЯМ**



## Брус Уіліс ажаніўся ў прысутнасці былой жонкі

У нядзелю знаны амерыканскі актор Брус Уіліс узяў шлюб з фотамадэлькай Эмэ Хемінг. Пра гэта паведамляе амерыканская прэса. Цырымонія адбывалася на Карыбскіх астравах.

Рэпарцёры адзначаюць прысутнасць на вяселлі былой жонкі Ўіліса Дэмі Мур і іхнай дачкі.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Грошы з «Вашего лото» выбілі праз суд

Кампанія Doberman Film за чатыры месяцы 2007 года выканала па замове латэрэі абъём рэкламных працаў на 100 млн. рублёў. Але грошай не атрымала. Тады рэкламная кампанія звярнулася ў суд. Паводле рашэння Гаспадарчага суда ў Мінску «Ваше лото» цяпер мусіць заплаціць па рахунках Doberman Film.

### Студэнтаў навучаць эканоміць

Новы спецкурс збіраюцца ўвесці ва ўсіх беларускіх ВНУ. Студэнтам раскажуць, што трэба эканоміць, і навучаць правільна гэта рабіць. З такой прапановай выступае Міністэрства адукацыі.

### Крымінальная справа супраць кіраўніцтва «Мінскэнэрга»

Службовыя асобы «Мінскэнерга» працяглы час хавалі факты вялікіх стратаў электраэнергіі ў перадавальных сетках і скажалі дзяржаўную статыстыку. Гэта высветлілі супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення Міністэрства ўнутраных справаў па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі падчас кантролю рацыянальнага захавання нарматываў энергаэфектыўнасці.

### Перадаем на праезд і марыхуану

Гомельскі кіроўца маршруткі затрыманы гандляваў наркотыкамі не ўстаючы з працоўнага крэсла. Раскрыць злачынства дапамагла жанчына, якой кіроўца прапанаваў набыць наркотык. Парушальнік пакараны на 8 год свабоды з канфіскацыяй маёмасці.

### Чым думалі?

Генеральны дырэктар КУП «Гаррэмаўтадор Мінгарвыканкаму» Іван Гурыновіч шкадуе пра знос кіёскаў з прыпынкаў грамадскага транспарту сталіцы. Па яго словах, прыпынкі цяпер патрабуюць выдаткаў на падтрыманне чысціні. Раней прыбіралі гаспадары кіёскаў.

**ДГ; ЯМ; Барысаў Электронны, Ежедневнік**

# Монстр на Старажоўскай

Фірма «Трайпл» мае збудаваць у цэнтры Мінску гіганцкі даходны дом, які разбурыць мінскі краявід. Піша архітэктар **Ігар Байцоў**.

У Мінску разнесліся весткі, што ў цэнтры гораду, на беразе Свіслачы — побач з Траецкім прадмесцем, неўзабаве пабудуюць вялізарны гмах — 23-павярховы жылы комплекс. Яго хочуць размясціць на маленькім лапіку зямлі — на тэрыторыі жылога кварталу паміж вуліцамі Максіма Багдановіча, Архітэктара Заборскага і Старажоўскай. Калі праект ажыццявіцца, гмах будзе амаль у два з паловай разы вышэйшы за ўжо існуючы побач доўгі жылы дом №8 па вуліцы Старажоўскай. У выніку жыхары кварталу будуць пазбаўленыя паўнавартаснай дваровай прасторы, намнога паменшыцца натуральная асветленасць памяшканняў кватэр.

Гэты праект, выкананы УП «ТМ Ладкіна А.А.», супярэчыць усім распрацаваным і зацверджаным раней горадабудаўнічым канцэпцыям ансамблевай забудовы цэнтру гораду. З’яўленне на гэтай тэрыторыі комплексу такіх грандыёзных памераў яўна не да месца. Сваёй празмернай вышынёй і масай гэты комплекс будзе прыгнятаць і прыніжаць усё архітэктурнае атачэнне, што ўжо склалася. Гэты аб’ект будзе бачны з розных бакоў, а запраектаваны ён як нейкая архітэктурная шырма з адным парадным бокам, арыентаваным на помнік Пушкіну. У панараме, бачнай з плошчы Васьмага сакавіка і схілу Верхняга Гораду, ён будзе ўзвышацца над Траецкім прадмесцем у вельмі няўдалых ракурсах, што прынясе вялікую шкоду абліччу забудовы. Вуліца Архітэктара Заборскага — своеасаблівая частка гістарычнай вулічнай сеткі, якая злучае прастору Траецкай гары з ландшафтам рачной даліны, — фактычна ператворыцца ва ўнутрыквартальны праезд. Помнік Максіму Багдановічу будзе звернуты тварам не да адкрытай прасторы і ракі, а да дваровага фасаду вялізарнага жылога дому, несумаштабнага забудове вуліцы М.Багдановіча.

Жыхары кварталу нязгодныя з гэтым праектам, яны шукаюць дзейснай падтрымкі у розных інстанцыях. Яны заклапочаны не толькі сур’ёзным пагаршэннем умоваў пражывання, якое ім пагражае. Яны заклікаюць да рэканструкцыі і добраўпарадкавання гэтай тэрыторыі з улікам яе гістарычнага мінулага. Яны заклікаюць улічваць, што «гэты куток Старога Гораду на схіле Траецкай гары звязаны з імёнамі першай беларускай пісьменніцы Элаізы Пашкевіч (Цёткі); вядомага педагога, прафесійнага фалькларыста, бібліяфіла і бібліёграфа Адама Багдановіча — бацькі Максіма Багдановіча, які нарадзіўся ў доме, што знаходзіўся на вул. Аляксандраўскай, 25 (цяпер вул.Багдановіча, 23а); журналіста Аляксандра Уласава і іншых». Жыхароў здзіўляе, што «на конкурснай аснове не было прапанавана праекту, які б спалучаў у сабе інтарэсы гораду і збережэння гісторыка-культурных каштоўнасцяў». Жыхары кварталу падтрымліваюць рэалізацыю распрацаванага раней праекту ўзнаўлення дому Багдановічаў, што знаходзіўся на дваровай тэрыторыі кварталу, і стварэнне ў ім музею. Частку кварталу яны прапануюць ператварыць у мемарыяльны сквер, у якім быў бы да месца помнік Алаізе Пашкевіч. Усе гэтыя прапановы жыхароў даюць магчымасць стварыць годную цэнтру сталіцы выразную архітэктурна-ландшафтную кампазіцыю, якая ўзбагаціць прылеглую да ракі прастору.

Праект комплексу, распрацаваны УП «ТМ Ладкіна А.А.», узгоднены і ў Міністэрстве культуры, і ў Камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва, архітэктуры і добраўпарадкавання Мінгорвыканкаму, хоць недапушчальнасць яго з’яўлення на гэтым месцы — рэч відавочная. Усе калегі-архітэктары, з якімі мне давялося сустрэцца ў апошні час, лічаць менавіта так. Няма сумневу, што і тыя з архітэктараў, што ўдзельнічалі ва ўзгадненнях праекту, гэта добра разумеюць. Бяда ў тым, што яны чыноўнікі не такога высокага статусу, каб не паддацца моцнаму ціску багатых інвестараў.

Цяпер, калі ва ўладальнікаў вялікіх грошай з’явілася магчымасць будаваць у Мінску высокія дамы для атрымання прыбыткаў, яны імкнуцца размясціць свае пабудовы як наймага большых памераў на выпадковых месцах у самым цэнтры гораду — на пляцоўках пакуль не забудаваных ці з мінімальным зносам наяўных пабудоваў. Перашкода такім імкненням — канцэпцыя ансамблевай забудовы, якой кіраваліся дагэтуль пры праектаванні беларускія архітэктары. Але цяпер на замовы прыватных інвестараў распрацоўваецца шэраг праектаў на прынадных месцах у парушэнне ансамбляў, што ўжо склаліся. Фактычна гэта адмова ад самога прынцыпу ансамблевай забудовы, які быў адной з самых галоўных каштоўных адметнасцяў Мінска.

З’яўленне гэтага комплексу на Старажоўцы, ці хмарачосіка ля Кастрычніцкай плошчы, ці высачэзных дамоў-цыліндраў на вуліцы Максіма Танка будзе прэцэдэнтам, які здыме ўсякія маральныя абавязкі паважаць створанае папярэднікамі і іх задумы. Мінск, гэты «мілы сэрцу горад мой», пачне хутка мяняцца стыхійна і стане падобны на многія гарады без архітэктурнага мінулага ў адсталых краінах. А можа, усё ж такі грамадства прачнецца і адчуе калектыўную адказнасць за лёс нашай сталіцы?

У Мінску ўжо многа разоў пачыналі ламаць існуючае і перакройваць незавершанае. Пара ўжо спыніць гэтую недарэчную традыцыю і пачаць па-еўрапейску зберагаць і паважліва дапрацоўваць тое каштоўнае, што мы цяпер маем.



**Хто будуе**

ТАА «Трайпл», якое належыць блізкаму да беларускіх уладаў бізнэсоўцу Юрыю Чыжу **(на фота)**, уладальніку мінскага футбольнага клубу «Дынама».

**Што будуюць**

Жылы комплекс з убудаванымі адміністрацыйнымі і гандлёвымі памяшканнямі і гаражом-стаянкай.

**Хто спраектаваў**

Той самы архітэктар Алег Ладкін, што, разам з Юрыем Грыгор’евым, быў аўтарам праекту «Дому на набярэжнай» (вул.Старажоўская, 8).

**Калі скончаць**

Тэрміны будаўніцтва акрэсленыя ад студзеня 2009 да сакавіка 2012 г.



**Схематычная маштабная выява сілуэту комплексу ўмантавана ў фотаздымак. Менавіта з гэтага ракурсу большасць мінчукоў і гасцей сталіцы будуць бачыць гмах.**



**Нават на рэкламнай камп’ютэрнай выяве комплексу бачна, што гэты аб’ект непамерна вялікі для месца, дзе яго збіраюцца пабудаваць.**

## Культура хамства і даляра

«Маленькую Лілі апранаюць ад Армані і ў яе ўжо ёсць упрыгожванні з брыльянтамі», — захапляецца папулярная газета гісторыяй жыццёвага поспеху мінчанкі, якая выйшла замуж за прынца Дубаі.

Усё там супер: прынц падарыў жонцы трэцюю машыну — чорны джып «Лэнд Ровэр». А малой у калыску Саід падарыў залатыя з брыльянтамі завушніцы. Ото ж яны ёй трэба...

Не пішуць, што брыльянты ад Армані ў таго прынца — у выніку жорсткай эксплуатацыі працоўных масаў у тых самых Эміратах. Там замежныя арбайтэры гарбацяцца за капейкі, а ставяцца да іх як да жывёлы. Не пішуць, што другім бокам вось гэтае ні Богу ні людзям не патрэбнае раскошы ёсць галеча мільёнаў, смерць мільёнаў дзяцей ад недаядання, недагляду, хваробаў. А таксама марнаванне рэсурсаў Зямлі на джыпы, што жлукцяць бензін.

Захаплення вартыя людзі, што здзейснілі подзвігі дзеля сваіх братоў, людзі, якія пераўзышлі свае прыродныя сілы, якія паслужылі чалавецтву. Інвалід у вазку, які дабіўся адукацыі і працы, варты ўвагі больш, чым прынц і ягоная жонка.

Навязваць брыльянты, джыпы і апранахі ад Армані як мэту жыцця і мерку шчасця — гнюсна і ёсць прыкметй дробнага розуму. «Культура хамства і даляра», — так пра гэта пісаў Янка Купала.

**Раман Семяненя, Мінск**

## Павевы лібералізацыі

Я працую ў сістэме Акадэміі навук, у адным з навуковых інстытутаў у якасці навуковага супрацоўніка. Працую ў галіне біятэхналогіі. Назаву сябе Віктарам.

Тое, што ў Беларусі даўно ўсё «схоплена» сеткай інфарматараў, асабліва ў дзяржаўных структурах і арганізацыях, для мяне не было сакрэтам. Я чалавек адкрыты, не баюся выражаць сваё стаўленне да таго, што адбываецца. Адкрыта выказваўся і буду выказвацца аб тым, што лічу ненармальным: аб уціску свабоды слова, аб разбурэнні помнікаў архітэктуры, аб фактычным знішчэнні беларусаў як народу. Я сябе лічу беларусам па нараджэнні — беларускай крыві ў мяне няма, я напалову татарын і напалову ўкраінец. Але не ў гэтым сэнс.

> Хіба можа прадуктыўна працаваць чалавек, якому паказваюць – ты пад каўпаком?

Калі я прыйшоў на працу ў інстытут, усё ішло ціхенька, ажно да таго моманту, калі я надумаў уступіць у партыю Беларуская хрысціянская дэмакратыя. І вось тут пачалося... Пачалі цікавіцца таварышы з органаў. Размовы, ціск на мазгі, ціснуць праз начальніцу.

Усё тое выглядае і смешна, і непрыемна. Не магу ўявіць сабе, каб да маіх навукоўцаў-калегаў у Германіі ці Швецыі прыходзілі супрацоўнікі спецслужбаў і ціснулі з нагоды іх жадання ўступіць у хрысціянска-дэмакратычную партыю. І які ж псіхалагічны фон ствараецца для маёй працы? Хіба можа прадуктыўна працаваць чалавек, якому паказваюць — ты пад каўпаком? Можа, дворнікам і можа. Але не дворнікі ствараюць багацце народаў сёння, а людзі, што даюць інтэлектуальны прадукт.

Спробы адрадзіць савецкую сістэму нічога добрага не дадуць. А я ў сваёй сітуацыі хачу проста дадаць, што ціску і каўпакоў баяцца не буду.

**Віктар, Мінск (поўнае імя пакідаю ў Рэдакцыі)**

# Адгукніцеся, дзеткі з фатаграфіі

Нядаўна хросны айцец маёй жонкі, які жыве на поўдні Нямеччыны, узяўся за спадчыну сваіх бацькоў. На гарышчы свайго дому ён знайшоў альбом з фотаздымкамі ягонага дзядзькі, якія той зрабіў падчас Другой сусветнай вайны па дарозе на ўсход. Сярод іх знайшліся і здымкі Гродзеншчыны, у тым ліку панарама самога Гродна, замак у Свяцку, які ў час акупацыі служыў школай для нямецкіх афіцэраў. Ёсць там і танк з нямецкім салдатам, які ўсміхаецца да фатографа.

Хросны бацька даслаў мне здымкі, бо ведае, што я пішу дысертацыю па гісторыі XX стагоддзя. І адразу ж напісаў: не ведаю, хто тут хто, і дзе і калі дакладна зробленыя здымкі. Але на іх надпісы, якія сведчаць пра тое, што ўсе яны зняты на Гродзеншчыне прыблізна ўвосень 1941 году.

Такім чынам, у маіх руках адзін фотаздымак нейкай беларускай вёскі, пра які ніяк не магу забыцца, калі пішу пра Гродна пасля вайны. На гэтым здымку столькі вясёлай моладзі, столькі жыцця, што вельмі хочацца даведацца, дзе гэта, як гэтая вёска прайшла вайну, як маюцца вось гэтыя дзеткі, якія, праўдападобна, у жніўні 1941 году бегалі за нямецкім патрулём: як бы яшчэ не ведалі, хто гэта такія.

Калі гляджу з часам на фотаздымак, знаходжу з кожным разам новую дэталь — у арыгінале здымак мае толькі 3 на 5 сантыметраў, але якасць стужкі тады была намнога лепшая, чым тая, якую дае большасць лічбавых камер сёння.



Ёсць на здымку контраст, бо бачна, што вось гэта была вёска глухая. З боку відаць хата, забітую дошкамі. Відавочная і беднасць саміх дзяцей — па іх вопратцы, але на іхніх абліччах не відаць вайны. Толькі хлопец на першым плане знаходзіцца ў пэўным страху. Далей ёсць калекі, жанчыны, а ззаду чарга — невядома па што. Бачныя дэталі архітэктуры хатаў, іх бедныя стрэхі — і грунтоўная, брукаваная вуліца. Чым больш гляджу, тым больш убачу, але і тым больш пытанняў з'явіцца ў мяне.

Якія былі думкі ў дзяцей? Чым была з пачатку для іх вайна? Колькі з іх выжыла ў вайну? А з якім пачуццём нямецкія салдаты ехалі праз гэтую вёску? Ці гэта для іх была проста экзотыка? Ці вярнуліся яны сюды пазней, ці гэта быў праезд на канечны прыпынак іх жыцця?

Гэтыя дзеткі з вясковай вуліцы – аб'екты маёй дысертацыі. Гэта яны пасля вайны пачалі перабіраць паціху ўсялякімі шляхамі ў Гродна [Рэд. — аўтар допісу, нямецкі гісторык Фэлікс Акерман, піша доктарскую працу пра гісторыю Гродна, ён свабодна валодае беларускай мовай і напісаў на нашай мове гэты ліст]. Хто як мог, праз школу, хто праз мястэчкі, армію ці ў ВНУ і на заводы. Магчыма, яны маглі б мне адказаць на пытанне, як Гродна стаў савецкім, як сюды пераехалі людзі з акалічных вёсак, калі горад ужо быў у руках савецкіх кадраў. Магчыма, яны маглі б мне патлумачыць, чаму перайшлі ад сваёй простай мовы на расійскую. Магчыма, хтосьці з іх памятае вось гэтую хвіліну, калі нямецкі салдат здымае дзяцей гэтай вёскі ў той момант, калі пакідае яе.

Трэба было б іх толькі знайсці...

**Фэлікс Акерман, Берлін (кантакт у Рэдакцыі)**

## МОЎНЫЯ ДРАБНІЦЫ

### Яго Эмінэнцыя і Яго Эксцэленцыя

У адной нацыянальнай газеце мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча карэспандэнтка назвала Яго Эмінэнцыяй. Як кажуць беларусы, каб вашы словы ды Богу ў вушы, бо эмінэнцыяй тытулуюць кардыналаў. А архіўладыка Тадэвуш пакуль што Яго Эксцэленцыя.

### Птушка і птушкі

У той сама газеце надрукаваная нататка «Веснавое паляванне на птушку».

На якую птушку будуць паляваць? І няўжо ўсім калектывам будуць паляваць толькі на яе, адну-адзіную?

Тут мы маем справу з відавочнай калькай з расійшчыны. Гэта ў Расіі палююць «на птицу, на зверя», нарыхтоўваюць «ягоду», збіраюць «чернику и малину». Гэта ў расійскіх лясох «много зверя развелось». У Расіі і гандлююць «книгой».

У беларусаў палююць на птушак і звяроў, нарыхтоўваюць ягады, збіраюць (ці ходзяць) у чарніцы, маліны. У беларускіх лясох развялося шмат (многа) звяроў. Беларусы гандлююць не адной кнігай, а кнігамі.

**З рассылак Анатоля Сідарэвіча**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29

## ВОДГУКІ

# «Доўгая дарога агента «Бімбы» (№7)

Артыкул «Доўгая дарога агента «Бімбы» выклікаў вялікі розгалас на сайце nn.by: за тыдзень чытачы пакінулі больш за восемдзесят каментароў.

Удзельнікаў форуму, прысвечанага артыкулу «Доўгая дарога агента «Бімбы», можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Мінак, які напісаў «Ну і якая мэта публікацыі? Праверыць, ці перажыве гэта ўсё ксёндз Булька?», прадстаўляе групу чытачоў, якія негатыўна сустрэлі артыкул пра агента «Бімбу». Людзі згадваюць заслугі мосарскага ксяндза: «Дзякуй скажыце чалавеку, што прыйшоў з чужбіны і робіць добрае ў нас». Чытач Палівач піша: «Пра Бульку, якіператварыў Мосар у турыстычную Мекку (прычым ездзяць не за голымі дзеўкамі, а на касцёл паглядзець) будуць помніць і пасля смерці».

Крытыкавалі артыкул і некаторыя чытачы з колаў духавенства, як чытач пад псеўданімам Asinus: «Не варта было брацца за гэтую тэму. Згадайце эпізод з «Братоў Карамазавых» Дастаеўскага, дзе, паміраючы, старац Засіма распавядае пра свайго брата, які перад смерцю прыйшоў да высновы, што мы ўсе ва ўсім вінаватыя. Выснова далёка не парадаксальная і не абсурдная, а вельмі глыбокая, калі разважаць пра таямніцу зла ў свеце. У каго з нас у жыцці няма такога, за што пякуча соромна, нават балюча, і чалавек вымушаны жыць з гэтым болем і з ім ісці на суд Божы? Кожны з нас нарабіў у сваім жыцці немала зла, таму ўсім заўзятым абвінаваўцам хачу нагадаць словы Хрыста: хто з вас без граху, няхай першы кіне камень. Вы так жадаеце праўды? Але, як сказаў Пілат, што ёсць праўда? Праўда ў тым, што ў той час у Літве ішла грамадзянская вайна, і сярод усіх тых, хто быў у яе ўцягнуты, немагчыма вызначыць, хто правы, а хто вінаваты. Таму кропку ў гэтай справе паставіць толькі Бог. Мы, звычайныя грэшныя людзі, не маем на гэта права. Не таму, што кс. Булька — святар, а таму, што ён — таксама звычайны, грэшны чалавек, а значыць, перад Богам мы роўныя і аднолькава з ім вінаватыя».

Частка аўдыторыі nn.by ўвогуле супраць узняцця ў СМІ такіх тэмаў.

Частка ж чытачоў лічыць за патрэбнае пісаць пра найвядомае мінулае не зважаючы на персоны, бо гэта карысна для грамадства ў цэлым: «Для грамадства, — піша чытач пад псеўданімам Адлеглы — такія разбіральніцтвы карысныя. Вось у Беларусі энкавэдыстам нічога не пагражае, што б яны ні зрабілі. Дажываюць у камфорце, кватэры ўздоўж праспекту Пераможцаў. І тыя, хто... Захаранку, Ганчара, Красоўскага... на гэта глядзяць і бачаць: а нікому ніколі ні за што не будзе, вось надзейны шлях: катаваць, забіваць для Улады».



«Ксёндз Булька — не шараговы грамадзянін. Гэта публічная асоба, — нагадвае чытач Сяргей. — Ніхто не адмаўляе ягоных заслугаў. Але ягоная публічнасць мецъ сваю цану — увагу прэсы. А пасля абвінавачванняў літоўскай пракуратуры, пагатоў, такая ўвага ёсць натуральнай [Аўт. — Як высветлілася, літоўскія следчыя выдалі ордэр на арышт кс.Бýлькі, абвінавачваючы яго ў датычнасці да 56 забойстваў, і калі б ён выехаў з Беларусі ў любую еўрапейскую краіну, яго адразу арыштавалі б.]. Больш за тое, дагэтуль нічога ўцямнага і сур'ёзнага ў супрацьвагу тым абвінавачванням кс.Булька не прадставіў. Тэма балючая. Праз гэта цяпер праходзяць чэхі, якія даведаліся падрабязнасці біяграфіі Кундэры. Некалі ў супрацы прызнаўся беларускі пісьменнік з Польшчы Сакрат Яновіч ».

Маем таксама і погляд з Літвы: чытач laputis напісаў (падаем у перакладзе з расійскай мовы): «Пасля ўсяго, што Булька натварыў пасля вайны, яму след было проста прызнацца і выбачыцца, і яму ўсё даравалі б. А ён схаваўся ў Беларусі».

СП

# Бяжы, Інтэрнэшнл, бяжы

**Том Тыквер, аўтар мастацкай даганялкі «Бяжы, Лола, бяжы», зняў фільм, які паўгоду таму ніхто б глядзець не стаў. Піша Павал Касцюкевіч.**

Дзіва што: ці мала фільмаў пра імпэтнага і справядлівага агента «Інтэрполу», які выкрывае банкіраў, што аплялі сеткамі даўгоў усе кіроўныя слаі свету? Адсутнасць яснага хэпі-энду бянтэжыла б таксама. А тут яшчэ гожая галоўная гераіня займаецца з гожым галоўным героем выключна расследаваннем фінансавых махінацыяў.

Але, бач, пад чорным лесам спаткаўся чорт з бесам — сусветны фінансавы крызіс. Крах фінансавых імперыяў у краінах, дзе паход у банк мала не штодзённая завядзёнка і досвед, — фільм міжволі прыцягваў увагу гледачоў і крытыкаў. Не так даўно «Інтэрнэшнл» нават адкрываў Берлінскі кінафестываль.

Выйшла нешта кшталту журналісцкага расследавання, а адсутнасць гор задымленых трупаў і лужын крыві ўпоравень з своечасовасцю тэмы толькі дадалі стужцы жаданай злавеснасці ды інтрыгоўнасці. Памятаеце італьянскі серыял «Спрут» пра бясстрашнага камісара Катані? У «Інтэрнэшнле» нам яшчэ раз нагадваюць пра існаванне, цяпер захраслай у банках, поскудзі, хаця не даюць рэцэптаў для адцінання яе шчупальцаў.

Тэорыя змовы ў ідэале выглядае так: дзесятак старцаў недзе ў не вельмі слынным, але вельмі зацішным кутку вырашаюць лёс планеты.

У «Інтэрнэшнле» тая тэорыя выглядае больш разгорнутай і верагоднай: у змовы заангажаваныя ўрады, палітычныя партыі і, вядома, банкіры. Яны не прадажныя — яны проста не могуць інакш.

Яны не хочуць гандляваць зброяй, яны не хочуць сваіх кандыдатаў у парламенце. Усё, у чым яны зацікаўленыя, гэта, паводле словаў аднаго з герояў, «валодаць вашымі даўгамі». У «Інтэрнэшнле» закранутыя карані, але хіба не названыя імёны. І паліткарэктна, і «з сэнсам»: запэцканыя ўсе.

«Найлепшая кілбаса — гэта панчоха з грашыма». У Беларусі банкам грошы з уласнай волі нясуць хіба пенсіянеры. Таму фільм для нас не дужа актуальны, але шчымлівая, універсальная струнка ў фільме адчуваецца. Прынамсі ў словах былога агента «Штазі», а цяпер начальніка аховы ў буйным банку, які вырашае супрацоўнічаць з «Інтэрполам»: «Гэта я не для сябе раблю, гэта для душы сваёй». Адвечны выбар паміж сумленнем і самазахаваннем. Падрабязна апісваючы, як, выйшаўшы за межы клеткі, ты ўсяго толькі патрапіш у яшчэ большую клетку, фільм уваднача цвердзіць, што ўсё адно гэты крок зрабіць трэба.




**Чаму варта глядзець стужку «Інтэрнэшнл»**

1. Дзеля панарамных здымкаў Мілану (горад не самы багаты на помнікі ў Італіі, затое тамтэйшага шкла і бетону хопіць на паў-Еўропы. Не забудзьце пра апошнія маркі машынаў у кадры).

2. Дзеля новай клямкі расійскіх перакладчыкаў: неангламоўныя паводле сюжэту людзі ў галівудскіх фільмах цяпер гавораць па-расійску з разнастайнымі акцэнтамі: адны адчайна картавяць па-нямецку, іншыя спяваюць з італьянскім санорам. Гучыць досыць пацешна.

3. Дзеля галоўнага актора Клайва Оўэна. Ён адзін з тых актораў, якія чым неахайнейшыя, чым больш памятымі, адмачаленымі і непаголенымі выглядаюць, тым ім лепей. А сюжэт пляжыць Клайва і не дае яму пільнавацца распарадку дня па поўнай праграме.

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Стары Ольса




Дрыгула, БМА-груп, 2009

Зачаравацца гукамі ліры, жалейкі, дуды.

Цудоўны альбом любоўна рэканструяванага старадаўняга інструменталу. «Стары Ольса» мысліць глабальна (аснова альбому — «Полацкі сшытак»), дзейнічае смела (музыкі зрабілі ўласныя аранжыроўкі акадэмічных твораў) ды яшчэ падае матэрыял з такой упэўненасцю, што нават абсалютна абыякавы да жыцця і творчасці ле Роя і Бакфарка чалавек можа зачаравацца гукамі ліры, жалейкі, дуды ды іншых інструментаў тых часоў. Альбом пачынаецца з энэргетычнай кампазіцыі «Дрыгула», якая б цалкам пасавала да саўндтрэку якога баевіка (каб яшчэ ў рокавым варыянке запісаць!). А фінальная песня была б да месца ў якім рэмейку-жахалцы пра Дракулу (вугорскі танец Drumul Draculi). Агулам у альбоме сыходзяцца тры пачаткі, так уласцівыя музыцы «Ольсы» — рамантычнасць (як у танцы «Гальярда»), гераічнасць (як у трэку Pagamoszka) ды такая карчомная весялосць (развіццё твору Niamiec, напрыклад). «Стары Ольса» з той нешматлікай катэгорыі музыкаў, якія запісваюць альбомы на ўсе часы.

### Дзмітры Смольскі




Подарок неба, Ковчег, 2009

Трэк «За Рогожской заставой» запісаны з прэзідэнцкім аркестрам.

Альбом-вяртанне аднаго з стаўпоў беларускай эстрады першай паловы 1990-х — беларускага дэ Бурга. Сваяком кампазітара ён не з'яўляецца, але кар'еру зрабіў не абы-якую. Колісь Смольскі спяваў у гродзенскай рок-групе «Рада» замест Аляксея Шадзька, потым пайшоў на эстраду, трапіў у студыю «Сяброў» і колькі гадоў яго твар не сыходзіў з экранаў БТ. Праз немалы перапынак артыст вырашыў вярнуцца на сцэну. Рознае кажуць пра тое, што з ім было ў гэты прамежак часу, але па сёлетнім дыску бачна, што Смольскі ізноў мае сур'ёзныя намеры. Яго выдадзеная праграма складаецца з перапрацаваных на сучасны лад «умца-умца» 1990-х з захаваннем той самай драм-машыннай аўры, новых песень і дуэтаў з зоркамі айчыннай поп-музыкі — Паплаўскай, Ціхановічам, Грыбалёвай, Барабаншчыкавай, а трэк «За Рогожской заставой» запісаны з прэзідэнцкім аркестрам. У альбоме пераважае спакойная гітарная баладнасць, бывае, гітара плача ну проста як у Сцінга. Выканаўцу часам не хапае тэхнічных магчымасцяў, каб давесці кампазіцыю да ладу, бо цяжка яго прапкнуць у адсутнасці музычнага густу. Няясна чаму на аздабленні этапнага для выканаўцы дыску было вырашана зэканоміць. Такое адчуванне, што гэта абавязковая ўмова для айчыннага поп-прадукту.

### Vinsent




Пачатак, БМА-груп, 2008

Кожнае з яго тысячы словаў мае сэнс.

Гучная, самаўпэўненая і аргументаваная заява дэбютанта Vinsent'а, які калегаў-рэпераў у сваіх тэкстах не чапае, але між радкоў чытаецца даклада: «Сярога, пасунься!». Магутная падача, выдатнае адчуванне мелодыі, чысціоткая мова, неблагія тэксты. Вінсэнт сфармуляваў свой кірунак у трэку «Рэпрэзэнт» як «рэп для эстэтаў». Кожнае з яго тысячы словаў мае сэнс, таму гэтыя 15 трэкаў зусім не грузяць. Можа, дурнаватая толькі чытанка «Валадар волі» — варта прадаць яе IQ48:). «Пачатак» зачароўвае і забірае ад самага пачатку і трымае да самага канца. Асабліва ўражваюць першыя трэкі: па-добраму нервовы і нахабны «Vinsent рэпрэзэнт», пяшчотная і драматычная «Адыходзяць караблі» (яе на радыё, і дзяўчат кі будуць плакаць пры першых яе гуках) і трэк з прэтэнзіяй на маніфест — «Я працягваю жыць» (кліп на яе просіцца). «Пачатак» смела можна ўключаць у спіс найлепшых музычных працаў гэтага году. Будзем чакаць працягу.

**Сяргей Будкін**

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Хто вы, Пятро Васючэнка?

Белетрыстыка хіліцца ў бок эсэістыкі, а літаратуразнаўства ў сваю чаргу пачало дрэйф у бок белетрыстыкі. Пасля Генадзя Кісялёва, адкрывальніка імені аўтара «Тараса на Парнасе», навука пра літаратуру ператварылася ў гістарычны дэтэктыў. Пасля Георгія Коласа, аўтара грунтоўных даследзінаў «Карані міфаў» пра творчасць і жыццё Янкі Купалы, — у псіхалагічны трымценнік. Новая кніга «Ад тэксту да хранатопа» — працяг завядзёнкі дэтэктыўнага літаратуразнаўства. Або літаратуразнаўчага дэтэктыву.

Хто вы, Пятро Васючэнка? Навукоўца, да(следчы)к, назіральнік або ўсё ж літаратар, (су)удзельнік, што цягае ахвяры на алтар выкшталцонай і лютай багіні, Літаратуры?

Пятро Васючэнка выразае беларускіх класікаў са звыклага, кашуля ды кумач, адраджэнскага і савецкага атачэння ды змяшчае іх постаці ў сусветны кантэкст. І неяк так раней не думалася, што аўтар містэрыі «Лабірынты» Вацлаў Ластоўскі жыў у адзін час з аўтарам яшчэ аднаго ментальнага падарожжа Джэймсам Джойсам, жывіўся з ім адным культурным паветрам, а класік беларускай паэзіі Максім Багдановіч сябраваў ( прынамсі духоўна) з паэтамі-сімвалістамі, у дадатак пішучы пад змрочным уплывам «праклятага паэта» Поля Верлена.




**Пятро Васючэнка. Ад тэксту да хранатопа.** Мінск: «Галіяфы», 2009, 195с., 300 ас.

### Мемуары Алеся Петрашкевіча

Аўтару гістарычнай трагедыі «Приласкать и уничтожить» пра стварэнне БНР, драматургу і пісьменніку, Алесю Петрашкевічу ёсць што распавесці.

Як чалавеку, які хлапчуком стаў перад расстрэлам, калі немцы, помсцячы за скінуты партызанамі цягнік, хацелі расстраляць жыхароў найбліжэйшай вёскі. Як сведку эпохі — рэктар мінскага Інстытуту культуры і загадчык аддзелу культуры ЦК КПБ, ён як ніхто іншы добра ведае суплёты машэраўскай палітыкі ў дачыненні да культуры і беларушчыны. Як навукоўцу, аднаму з рэдактараў Беларускай савецкай энцыклапедыі, стваральніку ўнікальнай, 140-томавай, кніжнай серыі «Памяць», якая занатавала ваенную хроніку ва ўсіх раёнах Беларусі.

Літаратуразнаўца Арсень Ліс лічыць Петрашкевічавы ўспаміны адной з найлепшых кніг, што з'явіліся ў беларускай мемуарыстыцы за апошнія гады. «Алесь Лявонавіч надта праўдзіва, рэалістычна перадаў атмасферу пасляваеннай і машэраўскай Беларусі. Падзеі грамадскага жыцця пададзеныя вельмі крытычна: чыноўнікі такія, якія яны ёсць, камсамольскі рух — без прыхарошванняў».




**Алесь Петрашкевіч. Крыніцы і каламуць.** Успамінальны аповед. Мінск: Медысонт. — 2008. 415с., 300 ас.

**Лявон К.**

# Край за небакраем, або Беларуская Прусія

**Дзе яшчэ ў Беларусі ёсць такія горы? Дзе яшчэ так чуваць подых Балтыкі? Пра Сапоцкін, Свяцк і ваколіцы піша Сяргей Харэўскі.**



Сапоцкін знянацку адкрываецца з дарогі. Мястэчка ўсё ў лагчыне.

Беларусь не сканчаецца на Гродне. І за Нёманам людзі ё.

На самым паўночным захадзе Беларусі, там, дзе заходзіць сонца, ёсць слаўнае мястэчка Сапоцкін, што змясцілася ў кутку межаў трох дзяржаваў: Беларусі, Польшчы і Літвы. Сапоцкінскі край, паўночна-заходняя частка Гродзенскага раёну — унікальны рэгіён. Калі хочаце пабачыць маленькую беларускую Польшчу — едзьце туды. Там нарадзіліся лідэры абодвух саюзаў палякаў Тадэвуш Гавін і Юзаф Лучнік і яшчэ эканаміст Яраслаў Раманчук.

Тут няма турысцкай штурханіны. Дарогі тут выдатныя — шырокія і гладкія. І пустынныя. Бо раней была памежная зона, якая ад гэтага году стала больш даступнай.

Адметны тут і клімат. Здаецца, прыслухаешся — і пачуеш гук балтыйскіх хваляў. Вецер з недалёкага мора дзьме ў тутэйшыя высачэзныя пагоркі, што на беларускае вока ўжо і горы.

Гэта адчувае кожны, хто пераязджае мост над віраплыннай рэчкай Ласоснай, ці, як яе тут пяшчотна называюць, — Ласасянкай. Спачатку паабапал дарогі разлягаюцца неагляднымя палі, што неўзабаве змяняюцца стромымі пясчанымі градамі, букатымі пагоркамі, зрэдчас парослымі купамі маладога сасонніку.

Часам з-за гары можна ўбачыць шпіль касцёлу альбо заімшэлы бетон немаведама ўжо чыіх — расійскіх, польскіх ці нямецкіх — фартоў...

А за Сапоцкінам, абапал Чорнае Ганчы і Аўгустоўскага каналу, стаіць дрымучы лес, што нырцуе пад калючы дрот і сыходзіць за ўсе межы. Гэта рэшткі былое Перстуньскае пушчы. Тут, у пушчанскіх нетрах, ёсць цэлы ружанец чыстюткіх азёраў. Да ляснога возера Кавеня, што па дарозе на Калеты, можна і падысці. Да іншых — самому не дабрацца.

Гэты наш акраец, па падзелах Рэчы Паспалітае, адышоў пачаткова да Прусіі, а затым, у выніку напалеонаўскіх кампаніяў і дыпламатычных гульняў, да Расіі. Але Сапоцкіншчына не трапіла наўпрост у Паўночна-Заходні край, а ўваходзіла ў расійскае Царства Польскае. Таму царскія ўлады так доўга

> **Дзе яшчэ ў Беларусі можна сядзець, звесіўшы ногі, на гары і глядзець уніз, на стрэхі дамоў?**

трывалі тут існаванне ўніяцкага веравызнання. 9000 тутэйшых грэка-каталікоў былі апошнімі беларусамі-ўніятамі. Па ўсёй Беларусі Унія была скасаваная ў 1840 г., але Сапоцкіншчына аж да 1875 г. уваходзіла ў склад Холмскай грэка-каталіцкай дыяцэзіі і зберагала старажытныя традыцыі.

Дарога з Гродна на Сапоцкін ляжыць праз Падлабенне, вялікую вёску, гродзенскае прадмесце. Ваколіцы выглядаюць вельмі заможна. Пасярод Лабы-Падлабення на гары стаіць вялікі храм, дзіўнаватай, нязграбнай архітэктуры. І праўда, пачаткова гэта была праваслаўная царква, пабудаваная на месцы старажытнай уніяцкай, у псеўдарускім стылі ў 1882 г. У Першую сусветную вайну праваслаўныя адсюль выехалі, і храм у 1929 г. пасля рэстаўрацыі высвяцілі ў каталіцкі касцёл Найсвяцейшае Панны Марыі. Людзі тут сёння не даюць веры, што некалі гэтае мястэчка было праваслаўным.

Калі збочыць з дарогі, то недалёка і вёска Адамавічы, што відаць здалёк, дзякуючы капітальнаму касцёлу на гары. Абапал дарогі, між жывапісных узгорыстых разлогаў, разлягліся лецішчы. Адамавіцкі касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшае Панны Марыі выдатна дагледжаны, як і тутэйшыя могілкі. Наогул, закінутых ці занядбаных храмаў па гэты, заходні бок Нёману, няма. Тутэйшыя сем вялікіх парафіяў аб'яднаныя ў Сапоцкінскі дэканат. А вось з праваслаўных цэркваў тут толькі малы прыход у самім Сапоцкіне. Такі вось вынік няпростае тутэйшае гісторыі.

У красавіку 1875 году і ў гэтым краі была ліквідаваная ўніяцкая царква. Вось што згадвае адзін са сведкаў тае эпохі: «Толькі казакі нагайкай умацавалі там урадавую веру. (...)Перашкоду працы казакаў ставіў касцёл, а калі яго зачынілі, народ лёг у ім, і казакі білі там людзей, дваіх забілі, колькі дзесяткаў страшна пакалечылі...»

Ад лета 1915 году і да 1919 Сапоцкінскі край быў акупаваны нямецкімі войскамі і зноўку далучаны наўпрост да Усходняе Прусіі. Аднак ад сярэдзіны 1919 году фактычна, а ў 1921 годзе і юрыдычна Сапоцкіншчына была далучаная да Польшчы, і колішнія ўніяты ператварыліся ў каталікоў, абы не быць праваслаўнымі.

Крыху далей, па іншы бок дарогі, між гораў прытулілася вёска Перстунь. Як і паўсюль на Сапоцкіншчыне, найлепшыя віды адкрываюцца не з дарогі, а з блізкіх пагоркаў. Тутэйшы храм Звеставання Панны Марыі быў пабудаваны пачаткова ў 1848 менавіта як уніяцкая царква, затым, пасля 1875, перароблены ў праваслаўную, а з 1919 году ўжо дзеіць як касцёл. Што звонку, сваім ампірным характарам, што ў сярэдзіне, рэштай царкоўнага ўбрання, гэты касцёл унікальны. І праўда, дзе яшчэ ўбачыш у касцёле, замест алтарнае скульптуры, стары іканастас?

Па другі бок дарогі на Сапоцкін, за колькі кіламетраў, — славуты Свяцк.

Тут знаходзіцца некалі шыкоўны палацава-паркавы комплекс Валовічаў, што быў пабудаваны ў 1779 г. італьянскім дойлідам Джузэпэ Сака. Аздабленне палацу ў Свяцку цяг-




**Сапоцкін**

мястэчка ў Гродзенскім раёне. За 21 км да паўночнага захаду ад Гродна, з якім злучана аўтамабільнай дарогай. Цэнтр біялагічнага заказніку «Сапоцкінскі». Гасцініца. Дом быту. Насельніцтва 1,4 тыс. чал. (2006).

**Сапоцкін вядомы** з XVI ст. як мястэчка Гарадзенскага павету Трокскага, з 1793 — Гарадзенскага ваяводства ВКЛ. Меў герб — у блакітным полі срэбны вол з залатымі рагамі.

З 1795 у складзе Прусіі, з 1807 — Варшаўскага герцагства, з 1815 у складзе Царства Польскага Расійскай імперыі.

У 1915—1918 — зноў у складзе Германіі.

З 1921 — у Польшчы.

З 1939 — у БССР, цэнтр раёну Беластоцкай, з 1944 — Гродзенскай вобл.

З 1959 — у Гродзенскім раёне. Касцёл, царква. На заходняй ускраіне мястэчка — помнік археалогіі, курганны магільнік (X—XI стст.) Каталіцкія могілкі, старыя габрэйскія могілкі.



**Пры дарозе варта агледзець ці не апошні мураваны ўніяцкі храм у Беларусі ў Перстуні. Затым ён быў перароблены на «мураўёўку». Цяпер гэта касцёл Звеставання Панны Марыі, але, што унікальна, пабудаваны на ўсходні манер, з старым іканастасам.**

нулася паўстагоддзя. Асабліва ўражваў другі паверх, у дэкоры якога спалучаліся рысы як барока, так і класіцызму. А парк, спавіты каналамі і ставамі, дасёння захоўвае рамантычную маляўнічасць. Супярэчлівыя ўражанні. І захапленне і роспач.

Але вось яшчэ адзін узгорак, другі, і... з гары ўжо відаць Сапоцкін, што ляжыць у даліне.. Адсюль ён увесь як на далоні. Адусюль відаць вялізарны тутэйшы касцёл Святога Іасафата, што быў пабудаваны Валовічамі яшчэ ў 1789 годзе, у часы панавання тут Прусіі! Цяжка распавядаць пра сапраўдны стан тутэйшых справаў, грунтуючыся не на канфесійных міфах ці ідэалагічных штампах, а на гістарычных фактах і жывых сведчаннях. Перабудова касцёлу пад Праабражэнскі жаночы манастыр у 1890-я на праваслаўны лад змянілі выгляд. Манашкі ў пачатку 1915 году эвакуяваліся, і ў 1916 годзе касцёл быў вернуты гаспадарам. Храм у Сапоцкіне — рэдкі храм, што носіць імя Іасфата Кунцэвіча.

Нават з першага погляду Сапоцкін выглядае салідна. Некалі ж, да 1959 году, ён быў цэнтрам асобнага раёну. І як мае быць у райцэнтры, тут стаяць дыхтоўныя, сталінскіх часоў, будынкі адміністрацыяў, кантораў ды клубу. Помнік землякам, дагледжаны сквер. Адно толькі назвы вуліцаў ужо не савецкія: Яна Паўла II, Элізы Ажэшкі, гэнерала Вільчынскага. Сапоцкін цяпер — апірышча Саюзу палякаў у Беларусі. Люд тутэйшы гаворыць на сакавітай беларускай мове, устаўляючы старыя паланізмы. Жанчыны, дарэчы, болей імкнуцца гаварыць па-польску.

Пасярод Сапоцкіна — дзіцячы садок, пабудаваны акурат на старажытным царкавішчы. Тутэйшая мураваная Успенская царква была пабудаваная для ўніятаў яшчэ ў 1780 г, але за Саветамі закрытая, перароблена на склад тытуню, а ў 1970-я разбураная. Ад яе ацалелі толькі цыклапічныя сцены падпорнага муру тэрасы, колішняга цвінтару. А вось цяпер на колішніх магілах — тэрыторыя сапоцкінскага дзіцячага садка. Засталіся яшчэ і царкоўныя прысады. Людзі ахвотна распавядаюць, што тут было раней, і абураюцца, дзеля чаго ж паставілі садок на костках.



**Сапоцкінскі касцёл Святога Іасафата усё будаваўся ад 1789 году: за прускім, расійскім, польскім часамі. Розныя эпохі надалі святыні непаўторны выгляд.**



**Святы Іасафат Кунцэвіч. Вітраж у сапоцкінскім касцёле.**

Вакол Сапоцкіна — вялізарныя пагоркі. Дзе яшчэ ў Беларусі можна сядзець, звесіўшы ногі, на гары і глядзець уніз, на стрэхі дамоў?

У 1939 годзе тут кіпелі страшныя баі. З аднаго боку нямецкія, з другога — савецкія войскі, атачылі ў раёне Сапоцкіна шматтысячную групоўку польскіх войскаў. Магілы жаўнераў у сапоцкінскіх ваколіцах — сведчанне самай драматычнай старонкі мясцовай гісторыі.

З канца таго векапомнага 1939 году Сапоцкін стаў раённым цэнтрам Беластоцкае вобласці Беларусі. Але ў 1944 г., гэтаксама раптоўна, траціну Сапоцкіншчыны аддалі Польшчы... Гэтак упершыню за ўсю сваю агляднную старадаўнюю гісторыю гэты куток беларускае зямлі аказаўся разарваным на два кавалкі. Напамінам пра бурлівую і нялёгкую гісторыю Сапоцкіншчыны засталіся храмы, старадаўнія руіны, курганы, раскіданыя сярод цёмных лясоў. У недалёкай вёсачцы Калеты, што прыткнулася ў самым куточку, між межаў, адна з найбольшых брацкіх магілаў 1939 году.

Тут, на гарах, засталіся таксама нейкія цыклапічныя падмуркі з агромністых валуноў. Але адкуль яны — не дадуць рады распавесці нават людзі з суседніх хатаў. Затое можна, нікога не пытаючыся, удосталь паласавацца суніцамі, назбіраць грыбоў, пацікавацца за пярэстымі казюркамі і надыхацца свежым горным паветрам. І глядзець, глядзець за далягляд... Вунь у тым баку, за лесам, — Польшча, а за той гарою — Літва.



**Звесіўшы ногі з гары, можна ўдосталь наглядзецца і на панараму мястэчка, і на местачковы побыт.**





**Вонкава моўны рэжым у Сапоцкіне — па местачковаму падкрэслена расейскі. А вось назвы вуліцаў — падкрэслена новыя.**



**Вёска Калеты прытулілася ўжо ў самым куточку між межаў. Тут сканчаюцца дарогі. На цвінтары пры капліцы – брацкія магілы герояў і ахвяраў верасня 1939 году.**



**Вяртацца ў Гродна можна па іншай дарозе, праз Гожу, дзе акурат і праходзіла некалі пруска-расійская мяжа. Каб пабачыць гожы старасвецкі касцёл Пятра і Паўла ў адной з найстарэйшых каталіцкіх парафіяў у Беларусі.**

Добрых падарожжаў у невядомую Беларусь зычыць «НН»!

# Drum Extasy



PHOTO.BYMEDIA.NET

**2 красавіка ў клубе «Гудвін» (пр.Незалежнасці, 19) бубніць гурт Drum Extasy. Пачатак а 20.00.**

## КАНЦЭРТЫ



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Крама

**27 сакавіка ў к/з «Мінск»** — вялікі сольны канцэрт «Крамы». Спецыяльны госць — Мікалай Аруцюнаў. **Пачатак а 19-й.**

### Танчыць Палац

**2 красавіка ў клубе «Дэжавю» (Валадзько, 6)** — гурт «Палац» з праграмай «Танчыць «Палац». **Пачатак а 20-й.**

### Расійская музыка пералому стагоддзяў

**У Доме Ваньковічаў (Інтэрнацыянальная, 33а)** — канцэрт «Горними тихо летела душа небесамі». У праграме — расійскія вакальныя і фартэпіянныя творы канца XIX і пачатку XX стагоддзя.

### Дзяржаўны ансамбль танцу

**26 сакавіка ў к/з «Мінск» (Кастрычніцкая, 5)** — канцэрт Дзяржаўнага ансамблю танцу «Учора! Сёння! Заўтра», прымеркаваны да 50-годзьдзя ансамблю. **Пачатак а 19-й.**

### Ill Nino

**26 сакавіка ў «Рэактары» (Харужай, 27)** выступае Ill Nino, гурт з ЗША лацінаамерыканскага паходжання. Ён лічыцца адным з найбольш цікавых калектываў альтэрнатыўнай сцэны, спалучае ў сваёй музыцы лацінаамерыканскія рытмы з нью-металам. Співаюць яны па-англійску, і па-іспанску. **Пачатак а 19-й**

### Прысвячэнне Queen

**29 сакавіка а 18-й у DA-club (П.Броўкі, 22)** — канцэрт-прысвячэнне гурту Queen.

## ІМПРЭЗЫ

### Магія Венецыянскага карнавалу

**26 сакавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — венецыянскі карнавал. Вас чакаюць артысты балету, оперы, музыкі, артысты тэатру трукаў.

### Батлейка ў Мінску

**28 сакавіка,** у гонар Дня тэатру, **у Доме творчасці дзяцей і моладзі (Адзінцова, 10, 2 паверх, актавая зала 237)** Уладзімір Кустаў і



пан Скіргайла ладзяць спектакль «Здані з батлейнай скрыні», а пластычны «Тэатр без тлуму і пылу» паказвае спектакль «Сцяна». **Пачатак а 15.00.** Уваход вольны. Даведкі праз т.: (029) 666-31-27 (Уладзімір).

### Гарэцкія чытанні

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (Багдановіча, 13) 9 красавіка** адбудуцца XVII Гарэцкія чытынні.

### Марыя Мартысевіч прадае кніжкі

**Кнігарня Логвінаў у галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасці, 43) прапануе**



**кожны чацвер з 18.00 да 19.00** купіць кнігу з рук сапраўднага беларускага літаратара. Або проста атрымаць ад пісьменніка аўтарытэтную параду, аўтограф, проста паглядзець. **26 сакавіка** ў кнігарні — Марыя Мартысевіч, пісьменніца, паэтка, журналістка і блогерка. Унікальная ва ўсіх творчых выяўленнях.

## ВЫСТАВЫ

### Адам Міцкевіч на паштоўцы

**У Музеі гісторыі Вялікай айчыннай вайны (Кастрычніцкая плошча) да 31 сакавіка** працуе выстава «Адам Міцкевіч на паштоўках канца XIX — пачатку XX стагоддзя».

### Алтарны жывапіс XVIII—XIX стагоддзяў

**У Мастацкім музеі (Леніна, 20) да 23 красавіка** працуе выстава «Алтары жывапіс Беларусі XVIII—XIX стагоддзяў». На выставе можна ўбачыць 33 творы рэлігійнага жывапісу Беларусі з фондаў музею, многія з якіх выстаўляюцца ўпершыню.



### Вялікае вяселле

**У PhotoGallery «Zнята» (пр.Незалежнасці, 13) да 10 красавіка** працуе фотавыстава «Вялікае вяселле».

### Вальс кветак

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 11 красавіка** працуе выстава аўтарскіх лялек і цацак «Вальс кветак».

### Творы Леаніда Шчамялёва ў прыватных зборах

**У мастацкай галерэі Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) да 11 красавіка** працуе выстава з серыі «Прыватная калекцыя», прысвечаная творам Леаніда Шчамялёва.

### Калаж. Асмабляж. Канструкцыя

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 29 сакавіка** працуе выстава «Калаж. Асмабляж. Канструкцыя». Гэты праект падкрэслівае блізкую юбілейную дату гісторыі калажу — яго стагоддзе.

### Выставы ў Палацы мастацтва

**У Палацы Мастацтва (Казлова, 3)** працуе мемарыяльная выстава М.Чурабы, прымеркаваная да 95-годдзя з дня нараджэння мастака. Тамсама можна ўбачыць персанальныя выставы Наталлі Чорнагаловы, чые творы адрознівае сапраўдная экспрэсія і гарачы тэмперамент, і У.Ткачэнкі, на якой можна ўбачыць працы, створаныя аўтарам яшчэ ў маладосці, а таксама за апошнія 10 гадоў. Асноўная маса работ мастака будзе паказаная ўпершыню.

### «Графема» ў музеі Янкі Купалы

**Да 5 красавіка ў Літаратурным музеі Янкі Купалы (Янкі Купалы, 4)** працуе выстава «Графема». Гэта выстава мастацтва, у якім знайшлося месца для літар, словаў і словазлучэнняў. Яна ўяўляе з сябе калаж арт-праектаў некалькіх мастакоў, у кожным з якіх у той ці іншай форме, з той ці іншай мэтай прысутнічае тэкст. У выставе бяруць удзел Уладзімір Цэслер, Руслан Вашкевіч, Аляксей Лунёў, Аляксей Губараў, Міхаіл Гулін, Антаніна Слабодчыкава, Сяргей Кірушчанка.

### Мы бачым

**У кінатэатры «Перамога» (Інтэрнацыянальная, 20) да 1 красавіка** працуе фотавыстава «Мы бачым». Розныя аўтары — розныя стылі, настроі і жанры фатаграфіі. Мы бачым вакол сябе людзей, адчуваем іх настроі, мы бачым прыроду і горад, мы бачым сённяшні свет...

## ТЭАТРЫ

### 26 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Малая зала імя Р.Шырмы** — «Цалёвачка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 27 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — Тэатральны капуснік»
**Малая зала імя Р.Шырмы** — «Брыдкае качаня»
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

### 28 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно» (Малая сцэна)
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»
**К/з «Мінск»** — «Залатая казка»
**Тэатр юнага гледача** — «Сястра мая Русалачка»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Музычны тэатр** — «Магія кахання»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Цяпер. Сёння... Назаўсёды!..»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

### 29 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — «КІМ»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»
**Музычны тэатр** — «Казка пра спячую прыгажуню»
**Тэатр оперы і балета** — «Чыпаліна»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і брадвей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман+Юлія»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Музычны тэтар** — «Баядэра»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр оперы і балету** — «Карміна Бурана», «Балеро»

### 30 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе...»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Маці» (Малая сцэна)
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»

### 31 сакавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Цырк-Шапіто** — «Легенды сусветнага цырку»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Музычны тэатр** — «Кажан»

### 1 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»
**Музычны тэатр** — «Марыца»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

### 2 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Купалаўскі тэатр** — Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Пацалунак начы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»

### 3 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр оперы і балету** — «Лебядзінае возера»

### 4 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»
**Музычны тэатр** — «Даратэя»
**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

### 5 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «КІМ»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Палац Рэспублікі** — тэатр звяроў «Куток дзядулі Дурава»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Ларга Уінч: Пачатак»

**Ларга Уінч: Пачатак** (Largo Winch)

Францыя, 2008, каляровы, 108 хв.

**Рэжысёр:** Жэром Саль

**Жанр:** Прыгоды

**Адзнака:** 6 (з 10)

Ларга Уінч — сірата, якога ўсынавіў мільярдэр. Пакуль тата катаецца на яхце — і гіне пры загадкавых абставінах, Ларга вандруе па Бразіліі, выратоўвае пекную дзяўчыну і б'ецца з паліцыяй. Але цяпер ён — нашчадак фінансавае імперыі — і шмат хто хацеў бы пазбавіцца ад яго.

Ларга прымае выклік.

Карціна Жэрома Саля — лёгкая французская стужка, непаліткарэктна-буржуйская, з офісным гламурам, мажардомам і мільярдамі, стэрыльна-ветлівымі забойствамі — і хіпушнай фрызурай, якая пасуе для высокіх прыёмаў.

Ніякага пралетарыяту, войнаў і сельскае гаспадаркі; ніякага выкрыцця «пануючага класу» — і ніякіх жабракоў з трушчобаў.

Гэта прыгоды, якія не абцяжарваюць; адмысловыя эфекты, якія не лезуць у вочы (але цалкам на сваім месцы); меладрама (і эротыка) — без рэфлексіі. Коміксавы Ларга Уінч з'явіўся ў 1970-я і толькі цяпер дажыў да экраннага ўцелаўлення.

Станоўчыя моманты стужкі — гэта маскі, даведзеныя акторамі да карэктна-ўцямнага ўзроўню, зразумелага і немаўляці. Хударлявы, з няправільным тварам Ларга Уінч (Томер Сіслэй)— авантурнік у вялікім офісе; уладалюбная і жорсткая Крысцін Скот Томас сыграла карпарацыйную мегеру. Пачуццёвая Мелані Цьеры — з датклівымі вуснамі і радзімкай на попе. І, нарэшце, любімы актор Кустурыцы — Мікі Манойлавіч — балканскі мільярдэр з таямніцамі і шматхадовымі камбінацыямі.

Калі вы сходзіце на карціну — не пашкадуеце. Калі прапусціце яе — ніхто вас за гэта не папракне.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 30 сакавіка—5 красавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 30 сакавіка, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** «Ранча», серыял, 19 серыя
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні» (пазнавальная праграма)
**19.05** «Галерэя Ады», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2007 г., Беларусь
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.40** «Еўрапейскі саюз без сакрэтаў», 4 серыя
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Без рэтушы»: «Пасля бомбы», рэпартаж, 2009 г., Польшча
*Падчас свята незалежнасці Рэспублікі Беларусь, 3 ліпеня 2008 г., непадалёк ад прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі выбухнула бомба. Увесь свет пасля пабачыў спакойнага, разважлівага «бацьку», які на месцы выбуху даваў парады ратаўнікам, як дапамагаць параненым, кансультаваў міліцыянтаў, суцяшаў пацярпелых. Афіцыйная прапаганда трубіла пра кансалідацыю ўсяго народу вакол правадыра.*
*Рэпартаж пачынаецца паказам архіўных фотаздымкаў з месца выбуху. Ноч, машыны «хуткай дапамогі» ды міліцыі, ляжаць параненыя, Лукашэнка ў белым гарнітуры — у цэнтры падзеяў. Раніца пачынаецца першымі спекуляцыямі наконт таго, хто і што зрабіў. Вінцук Вячорка, адзін з кіраўнікоў Партыі БНФ, папярэджвае, што ўлады могуць выкарыстаць выбух для расправы з апазіцыяй. Аляксандр Лукашэнка падчас вайсковага параду на лініі Сталіна дадае: «Гэта гніды. І мы ім пазакручваем шрубы на ілбах!»*
*Сярод дзесяткаў арыштаваных — актывісты ўжо няіснай арганізацыі «Белы легіён». Чаму арышты пачалі з іх, можна здагадацца: яны заўсёды былі палітычнымі апанентамі Лукашэнкі і гучна казалі пра гэта. У рэпартажы гаворыцца пра іх утрыманне пад вартаю, пра допыты, якім яны там падлеглі. Ці баяліся яны, што дзеля палітычных гульняў ім афіцыйна выставяць абвінавачанне ў здзяйсненні тэрарыстычнага акту, ці спадзяваліся хуткага вяртання на волю?*
*З моманту здарэння мінула нямала часу. Нягледзячы на шырокамаштабныя акцыі, арышты, масавыя допыты жыхароў сталіцы, павальную дактыласкапію мужчынскага насельніцтва краіны — вінаватых так і не знайшлі. Ці ўдалося што-небудзь даведацца? Ці гэта была чарговая спекуляцыя ўладаў, як гэта мела месца раней у Віцебску? Гэтыя пытанні сталі прадметам журналісцкага расследавання, праведзенага аўтарам рэпартажу.*
**21.40** «Цалуй, каго хочаш», камедыя, рэж. Мішэль Блан, 2002 г., Францыя—Брытанія—Італія.
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 6 серыя
**00.10** Аб’ектыў (навіны)

### 31 сакавіка, аўторак

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 6 серыя
**18.55** «Язда», маст. фільм, рэж. Ян Сверак, 1994 г., Чэхія.
**20.30** Minsk-Mixt—2008: ч. 3. Канцэрт гурту Dali
**20.40** Рэальная гаспадарка (эканамічная праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Ноч з генераламі», дак. фільм, рэж. Мар’я Змарз-Качановіч, 2001 г., Канада
*Кожны год у дзень абвешчання ў Польшчы ваеннага становішча пад вокнамі дому генерала Ярузэльскага збіраюцца дэманстранты. Для іх генерал — дыктатар, забойца. Што ён адчуваў, пра што думаў той ночы — з 12 на 13 снежня 1981 году?*
**22.05** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.30** «Без рэтушы»: «Гастарбайтэр», дак. фільм, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь
*Віктар Траццякоў — беларускі гастарбайтэр, якіх цяпер сотні тысячаў. Кожныя некалькі месяцаў ён пакідае сваю хату ў Оршы і едзе ў Расію «на шабашку», бо мусіць карміць сям’ю. Па колькіх месяцах вяртаецца дадому, дзе ніякай працы для яго так і не знаходзіцца. Адпачыўшы са сваёй сям’ёю, праз колькі тыдняў мусіць вяртацца ў Расію.*
*У Маскве, «горадзе вялікіх магчымасцяў», шмат каго з беларусаў чакае толькі статус гастарбайтэра — працаўніка другога гатунку, які згаджаецца на неафіцыйнае працаўладкаванне, на адсутнасць медычнае дапамогі, на штодзённую пагрозу ашуканства і рабункаў. Але яны шчаслівыя, бо зарабляюць больш за сваіх калегаў у Беларусі. Частку матэрыялу аўтар зняў проста на аб’ектах расійскае сталіцы.*
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 7 серыя
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 1 красавіка, серада

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 7 серыя
**18.55** «Рэвалюцыя, якой не было», дак. фільм, рэж. Алена Палуніна, 2008 г., Эстонія
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**21.45** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**22.05** «Гісторыя пад знакам Пагоні» (пазнавальная праграма)
**22.10** Форум (ток-шоу): Школьная рэформа: эксперыменты на дзецях.
**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 23 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 2 красавіка, чацвер

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 23 серыя
**18.55** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.15** «Еўрапейскі саюз без сакрэтаў», 4 серыя
**19.30** Беларусы ў Польшчы
**19.45** Кружэлка (сусветная музыка)
**20.20** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Першы дзень», дак. фільм, рэж. Марцін Саўтэр, 2008 г., Польшча
**20.45** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.50** «Мент», дэтэктыўны серыял, 24 серыя
**23.30** З архіву Jazz Jamboree, ч. 2: «Рэй Чарлз»
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 3 красавіка, пятніца

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 24 серыя
**18.50** «Цяжкі», дак. фільм, рэж. Мікола Бандарчук, 2007 г., Украіна
**19.10** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** Хто ёсць кім?: Ігар Неўпакоеў
**19.55** «Навала», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**20.25** Кухня (музычная праграма)
**20.45** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.35** «Парнаграфія», маст. фільм, рэж. Ян Якуб Кольскі, 2003 г., Польшча
*Экранізацыя аповесці Вітальда Гамбровіча.*




**23.30** «На поўных абаротах», серыял, 3 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 4 красавіка, субота

**18.00** Аб’ектыў (навіны)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Транзіт», дак. фільм, рэж. Джоан Рычардсан, 2008 г., Румынія
*Як змянілася Румынія пасля 1989 г.? Аўтар аналізуе падзеі нядаўняй гісторыі праз прызму здарэнняў, што адбыліся з яго сям’ёю, вымушанай іміграваць. Шмат што змянілася за гэтыя часы, але па-ранейшаму Румынія — для аўтара гэта найперш лінія, што лучыць гарады Тымішаара—Клюж-Напока—Яш, звязаныя ў адно лёсам ягонае сям’і, — нагадвае транзітную тэрыторыю. У старажытнасці тут праходзілі рымскія легіёны; потым былі стагоддзі аўстрыйскага і венгерскага панавання; нарэшце глыток свабоды ў міжваенны час, а пасля зноў нявызначанасць у віхуры фашысцкага, камуністычнага і сённяшняга ліхалецця. Гэтае пачуццё «транзітнасці», няпэўнасці, неакрэсленасці вычуваецца ў спалучэнні помнікаў рымскай эпохі ды новазбудаваных палацаў са шкла і бетону, традыцыйнага праваслаўя і новай філасофіі спажывання, у абагаўленні, знесляўленні ды зноў усхваленні старых-новых герояў. У гэтым — уся Румынія з яе стракатаю мінуўшчынаю і цяперашчынаю.*
**19.15** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** Канцэрт гурту N.R.M., ч. 1
**20.40** Маю права (прававая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Невядомая Беларусь»: «Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, рэж. Леанід Міндлін, 2009 г., Беларусь, ч. 2
**21.50** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.20** Суботні сеанс: «Вышук», маст. фільм, рэж. Тэрэнс М. О’Кіф, 1998 г., Канада.
*Маладзён Джымі лічыць, што ненаўмысна забіў чалавека. Ён уцякае з гораду і выпадкова сустракае двух хлопцаў, якія ўцяклі з рэлігійнай школы. Разам яны вяртаюцца ў школу, Джымі застаецца там пад псеўданімам на тыдзень, працуе маляром, адначасова кахаецца з медсястрою Сью і дапамагае святарам знайсці падыход да гарэзлівых вучняў. Сям’я забітага мужчыны шукае Джымі. Хлопец ідзе на споведзь і вырашае здацца паліцыі, але пра здарэнне імгненна атрымліваюць інфармацыю... бандыты — ад свайго чалавека ў паліцыі — і першымі прыязджаюць па Джымі...*
**23.50** «Бульбаны», мультсерыял
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 5 красавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 20 серыя
**19.05** Minsk-Mixt—2008: ч. 1. Канцэрт гурта «Джамбібум»
**19.35** «Незалежныя», дак. фільм, рэж. Яцэк Тальчэўскі, 2006 г., Польшча
*Незалежная асацыяцыя студэнтаў (НАС) была легальнаю толькі першае дзесяцігоддзе свайго існавання. Студэнцкія страйкі сталі вырашальнымі для канчатковай адмены цэнзуры. У сваіх патрабаваннях студэнты закраналі тыя праблемы, пра якія «Салідарнасць» наагул нічога не гаварыла, напрыклад, пра войска. Самым вялікім поспехам НАС стала рэформа адукацыі 1981 г. Пра што марылі студэнты? Чаго дамагаліся? У якой Польшчы жадалі жыць? У якіх універсітэтах вучыцца? Як зарганізоўвалі пратэсты? Як рэагавала грамадства на студэнцкія выступы? Што рабілі ўлады, каб спыніць студэнцкія бунты?*
*Падзеі фільму ахопліваюць перыяд з канца 1970-х да другой рэгістрацыі НАС у 1989 г.*
**20.30** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні» (пазнавальная праграма)
**21.30** Форум (ток-шоу): Краіна ў запоі.
*Амаль год таму на «Форуме» ўпершыню ўзнялі тэму масавага п’янства ў Беларусі. Аўтары засяродзіліся на медычна-біялагічных і маральна-этычных аспектах гэтай з’явы. Праз год зноў вяртаемся да гэтай тэмы, аднак разглядаем яе як сацыяльна-палітычную праблему. У 2008 г. беларусы выпілі рэкордную колькасць алкаголю: 12,4 л чыстага спірту на чалавека. Калі не лічыць дзяцей і людзей сталага веку, а таксама непітушчых, выходзіць, што астатнія беларусы ўлілі ў сябе больш за 30 л алкаголю на чалавека. Гэта афіцыйныя звесткі, агучаныя міністрам аховы здароўя Васілём Жаркам на паседжанні Савету Міністраў. Вядома, з акцызу дзяржаўны бюджэт атрымлівае дадатковыя грашовыя ўліванні. Аднак ці не лагічна ў гэтым пабачыць не толькі і не столькі выгадны дзяржаве гешэфт, колькі свядомае спойванне нацыі? Як бараніцца ад гэтага?*
**22.15** Фільматэка майстроў: «Угару, уніз», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2004 г., Чэхія
**00.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Асцярожна, акультызм!

Строгая сакрэтнасць, якой суправаджаецца правядзенне Дзён цвярозасці, будзе мець плён толькі тады, калі ўсталюецца жорсткі кантроль за экстрасэнсамі — асобамі, якія могуць чытаць думкі іншых людзей. Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

Цэлы тыдзень на сцяне Дома культуры мястэчка Н. вісеў яскравы плакат: «Прыехаў друід — дыпламаваны выпускнік манастыру Шаалінь, любімы вучань Чумака і Коперфільда, магістр магіі. У праграме — адкрыццё трэцяга вока, зняццё ўрокаў, падвышэнне заробкаў, сеанс адначасовай гульні ў «Спортлато» і «Ваша лато». Толькі адзін выступ у нашым райцэнтры!»

Зала была поўная. Згасла святло, паднялася заслона. З-за яе з'явіўся экстрасэнс — мужчына сярэдніх гадоў з зачосам на лысіну. І пачаўся сеанс магнетызму. Першай на сцэну, як звычайна, выскачыла пенсіянерка: няма рады на жукоў, апанавалі соткі. «Для магнетызму няма нічога немагчымага, — заявіў экстрасэнс і некалькімі адточанымі пасамі зарадзіў станоўчай энергіяй вядро дусту. — Пырскайце раз на дзень, і як рукой здыме».

Наступным быў мясцовы настаўнік фізкультуры, упэўнены, што яго сурочылі. «Прасцей не бывае! — адгукнуўся маг. — Лічыце, што ўрокаў ужо няма! Здымаю з вас урокі ў 8«Б», 4 і 5 «А», а таксама паралелі 10 і 11 класаў. Застаецца паўстаўкі!»

Настаўнік спрабаваў пратэставаць, што не тыя ўрокі знялі, але яго сцягнулі з сцэны нецярплівыя наступнікі.

Выхад наступнага просьбіта выклікала ў зале заўважнае напружанне.

— А слабо прачытаць, што думае начальнік міліцыі? — недаверліва скрывіўся на экстрасэнса шчацівісты суб'ект.

Маг напружыўся, аж пачырванеў, і выдаў іншым, глухім начальніцкім голасам: «Я т-табе пачытаю, т-ты ў мяне на сутках вуліцу 17 верасня да першага снегу месці будзеш».

Цікаўны скочыў за кулісы і схаваўся ў пажарную скрыню з пяском.

Па зале пракаціўся выдых расчаравання: «Не ведае...»

— Ну добра, — пачуўся голас з месца. — А што думае начальнік абласной міліцыі?

Маг засяродзіўся:

— Заходжу ў аблвыканкам. Ага, вось яго прыватнае поле... Спрабую наладзіць спірытычны канал, дэкадзірую флюіды... Ёсць! — Ну! — напружылася зала.

— Начальнік правярае графік зняцця адбіткаў пальцаў у наведнікаў ясельных і дашкольных установаў!

Зала зноў расчаравана ўздыхнула.

— Гэта ўсё ладна, — голас з залы аж трымцеў ад рашучасці. — А вось думкі яшчэ вышэйшай міліцэйскай шышкі вам ні за што не адгадаць!

Прыхільнік канцэпцый Блавацкай і Штайнера не хацеў дэманстраваць слабінку. У абсалютнай цішы, якая павісла з у залі ДК, загучаў яго маналог:

— Так, мы ў Мінску, заходзім у Міністэрства, ага, вось прыватнае поле аднаго высокага чыноўніка. Спрабую наладзіць спірытычны канал, дэкадзірую флюіды. Ёсць! Цяпер супрацоўнік міністэрства змагаецца са сном і прагай сысці ў адпачынак. Ён гераічна стварае сацыяльна-псіхалагічны партрэт сярэднестатыстычнага спажыўца соку «Садочак»... Паралельна думае што цешча...

— Не тое! — сарваўся на істэрыку голас з залы. — Пра што яшчэ ён думае?

— Ага, ён думае прызначыць дзень цвярозасці на, на... пачакайце мне трохі замінаюць электроды, якія вылучае планета Венера. Ага, бачу! Наступны Дзень цвярозасці будзе...»

Уся зала ахнула і падалася наперад.

— Стаяць! — з-пад столі спусціліся чалавекі-павукі ў чорнай форме. «Ляжаць!» — паклалі яны экстрасэнса на падлогу і звярнуліся да залы: «Сядзець!»

Бедалага-маг не ўлічыў, што канал сувязі, які ён адкрыў, быў двухбаковы. Міліцэйскі чын, адчуўшы нетыповае варушэнне ў галаве, адразу выклікаў опергрупу.

Публіка маўчала ў захапленні перад магчымасцямі эзатэрычных практык.



Каму вясна, а каму — хана…

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ЖАРТ

* * *

— Спадар прэзідэнт, у многіх нашых грамадзянаў узнікае пытанне з нагоды некалькіх вашых паездак на гарналыжныя курорты ў розныя краіны ў час крызісу. Хіба кіраўнік дзяржавы не павінен паказваць прыклад эканоміі?

— Ведаеце, я яшчэ раз паўтару, што крызісу ў нас няма. А што тычыцца майго адпачынку, то ўявіце: грымне крызіс, а я стомлены?

**belmy.Info**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПАЧУВАННІ

**Шчыра спачуваем Тамары Мацкевіч**, якая страціла маці. Цяжка, калі бацькі сышлі адзін за адным. Тамара, мы ўсе падзяляем тваё гора. Трымайся. Сябры, калегі-настаўнікі

**Выказваем спачуванні Лявону Юрэвічу** з прычыны смерці брата. Лявоне, трымайся! У цябе ёсць на каго абаперціся па абодва бакі акіяну. Сябры

### КУПЛЮ

**Куплю за сімвалічны кошт** дзічкі (непрышчэпленыя сеянцы) цытрусавых. Вялізныя экзэмпляры абмяняю на культурныя чаранкі. Сяргей (г. Мінск). Т.: 126-90-18, graj@mail.ru

### БЕЛАРУСКАМОЎНЫ САДОК

**Шаноўныя бацькі! Запрашаем** дзетак 3—4 гадоў у беларускамоўную групу ў дзіцячы садок №570 (вул. Чайлыткі, 8, мікраараён Сухарава). Тэл. (029)395-73-99 (Дар'я). Сабралася ўжо 12 дзяцей, запрашаем яшчэ трое — усяго для групы трэба 15.

### КНІГІ

**Шукаю** 26-27 і 29-30 нумары «Нашай Нівы» за 1997 гадоў. Т.: 227-43-70, 247-50-52, (029) 262-12-93. Марыя

### КВАТЭРА

**Здам** кватэру з мэбляй на працяглы тэрмін. Танна! Для беларускамоўных яшчэ танней! Т.: (029) 757-94-07

### ПРАЦА

**Выкладчык ВНУ дапаможа** падрыхтавацца да напісання цэнтралізаваных тэстаў па англійскай мове. Т.: (029) 550-75-05 (Мінск)

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Параф'янава, Віленскай губ., Вілейскага пав. Каля нас з'явіліся нейкія незнаёмыя людзі, што радзяць мужыкам ехаць на заработкі ў Сіцылію — туды, дзе нядаўна было землятрасенне і дзе разбурыўся датла горад Месіна. Яны даюць на першы погляд быццам і добрую цану — 40 рублёў на месяц. Але хто знае варункі ў Сіцыліі, той ведае, што 40 рублёў у месяц на сваіх харчах вельмі малая цана і што тамашнім работнікам плацяць разы ў тры болей. На дарогу назад яны грошай не даюць — а пехатой не вернешся. Сцеражыцеся, мужыкі, бо пасля вінавацiць будзеце толькі самі сябе!

**Наша Ніва. №12. 1909**

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Генадзевіч Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5520. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 24.03.2009.
Замова № 1592.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9 771819 161008 09012